незалежная газета

№ 41 (639) 4 лістапада 2009 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднойленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Ірына Абельская зноў узначаліла Лечкамісію**

Старонка 5



**100 самых паспяховых бізнэсмэнаў Беларусі**

Старонка 5



**Зянон Пазняк пра будучыню нацыі**

Старонка 10

**У НУМАРЫ**

**Хто заменіць Сідорскага?**
Пад прэм'ерам захісталася крэсла, хоць афіцыйная статыстыка вясёлкавая. **Старонка 3.**

**Кастрычніцкая рэвалюцыя на самой справе была рэстаўрацыяй**
Да такога вываду прыйшоў выдатны гісторык Расіі Рычард Пайпс. **Старонка 12.**

**Пошасці «залатога веку»**
Жыхары Мінска XVII ст. пакутавалі ад уздзеяння рэчыва, з якога ў XX ст. было сінтэзавана ЛСД. Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 13.**

**Прададзена 3900 беларусак**
Столькі ахвяраў гандлю людзьмі выяўлена з 2002 года. **Старонка 6.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Замоўчванне грыпу выклікала эпідэмію панікі

Копіі службовых дакументаў: людзі, заражаныя свіным грыпам, усё ж паміралі ад пнеўманіі. **Старонка 8.**
Доктар: Ад грыпу памагае нават сэкс. Вірусныя інфекцыі: сем практычных парадаў, як засцерагацца. **Старонка 9.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



**Слёзы Вікторыі Азаранкі**

Старонка 6.

## Пенсіянерам недаплачваюць па 43 тысячы

**Улады вырашылі не трымацца закона, а эканоміць.**

Павелічэнне пенсій з 1 лістапада пакінула пасля сябе шэраг нявырашаных пытанняў. У Законе аб пенсійным забеспячэнні пазначана, што пенсіі павінны быць павялічаныя з улікам росту сярэдняга квартальнага заробку.

Цяпер няхітрая арыфметыка — сярэдні заробак за красавік-чэрвень 2008 года склаў 859 тысяч рублёў. Якраз гэтыя лічбы ўлічваліся пры папярэднім павышэнні пенсій у жніўні мінулага года. Пасля таго больш за год пенсіі не павялічваліся. Цяпер квартальны заробак роўны 1034 тысячам рублёў. Атрымліваецца неадпаведнасць — заробкі выраслі на 20,3%, а пенсіі ўзнялі толькі на 9,5%.

Колькі ж недаплацілі пенсіянерам? Сярэдняя пенсія павялічылася на 37 600 рублёў, у той час як павінна была ўзрасці на 80 600 рублёў. Такім чынам, сярэднестатыстычны пенсіянер будзе недаатрымліваць па 43 тысячы рублёў.

За кошт гэтага бюджэт будзе ашчаджаць $38 мільёнаў штомесяц.

Урад матывуе гэта датрыманнем рэкамендацый Міжнароднага валютнага фонду, які настойліва раіць не павялічваць бюджэтныя выплаты. Пры гэтым пастаянны прадстаўнік МВФ у Беларусі Наталля Калядзіна зазначыла, што павышэнне пенсій не выклікае заклапочанасці ў арганізацыі.

**Ягор Марціновіч**



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

# Яшчэ адзін экс-старшыня беларускага КДБ пераехаў у Расію

Уладзімір Мацкевіч на гэты момант працуе дарадцам гендырэктара буйной расійскай кампаніі «Саўкамфлот». Як паведаміла «Народная воля», былы старшыня Камітэта дзяржбяспекі Беларусі на мінулых выхадных прыязджаў у Мінск падлячыцца.

Мацкевіч кіраваў Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ад 1995 да 2000 года. Яго звольнілі і выслалі паслом у Белград пасля таго, як ён даў санкцыю на прэвентыўнае затрыманне на 30 дзён тады яшчэ камандзіра вайсковай часткі 3214 Зміцера Паўлічэнкі. Гэта адбывалася ў рамках расследавання справы аб зніклых палітыках і бізнэсоўцах.

Гендырэктарам «Саўкамфлота» працуе Сяргей Франк. У 1998—2004 гадах ён быў міністрам транспарту Расіі, пасля — памочнікам прэм'ера Міхаіла Фрадкова.

У Расіі працуе таксама іншы былы старшыня Камітэта Леанід Ерын. Гэты — таксама ў транспартнай сферы. Дарадцам кіраўніка Расійскай чыгункі. Яшчэ адной структуры, якой шчыльна апякуецца клан Пуціна, самога выхадца з Федэральнай службы бяспекі.



На пенсіі пераехаў жыць у Падмаскоўе і першы старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі часоў незалежнай Беларусі Эдуард Шыркоўскі.

Нарэшце, у буйной кампаніі, якая займаецца нерухомасцю, знайшоў сябе Урал Латыпаў. Латыпаў не ўзначальваў КДБ, але з сістэмы спецслужбы прыйшоў кіраваць Адміністрацыяй прэзідэнта.

Беларусь — адзіная незалежная краіна Еўропы, у якой столькі найвышэйшых чыноўнікаў і асабліва кіраўніцтва сілавых структураў пасля адстаўкі выязджае працаваць у Расію.

**Мікола Бугай**

## «Советская Белоруссія»: Курапаты — могілкі агульнанацыянальнага маштабу

**Газета адназначна адмятае меркаванні «артадоксаў», што «ў нас такога быць не магло». Яна называе «ўродлівымі міфамі і кашчунствам» адмаўленне расстрэлаў у Курапатах пры Сталіну.**

Яна кажа, што прыйшоў час зразумець для ўсіх, незалежна ад поглядаў, што «Курапаты — гэта трагічны ўрок для грамадства: агрэсіўныя дактрыны, якімі б высакароднымі яны ні былі, калі прыводзяць да гібелі людзей — амаральныя».

Тым не менш, «час лечыць раны», і сёння «новыя пакаленні палітыкаў ужо не нясуць адказнасць за Курапаты».

«СБ» успамінае вахту моладзі па абароне Курапатаў у 2001 — 2002 гадах. «Юныя, гарачыя валанцёры бясстрашна кладліся пад калёсы раўнадушных грэйдэраў, якія пашыралі дарогу, карыслівыя палітычныя правадыры ўзначальвалі калоны і прамаўлялі палымяныя словы, мясцовыя жыхары ладзілі пад соснамі пікнікі, энергічныя дзевалаперы ўладкоўваліся пад шумок узвесці ў «жывапісным месцы» (у Курапатах!) выкшталцоныя вілы для багатых. Неразумныя і нячулыя падлеткі з наваколля раскопвалі магілы і ламалі ўсталяваныя добраахвотнікамі памятныя крыжы», — і за гэтым усім «моўчкі назірала мясцовая ўлада».

«Советская Белоруссія» піша: «Прыйшоў час гучна сказаць: Курапаты — гэта могілкі, прычым могілкі, калі можна так выказацца, агульнанацыянальнага маштабу».

**Зміцер Панкавец**

КАМЕНТАР

## Курапаты ці лінія Сталіна?

Цікава было чытаць, прызнаюся, не толькі саму публікацыю пра Курапаты ў «СБ. Беларусь сегодня», але і водгукі на сайце гэтай газеты. Піша **Віталь Тарас**.

### «Буржуазны нацыяналіст» Бярозкін і «палкоўнік Абакумаў»

Працытую толькі самы першы — пад нікам «генерал-палкоўнік Абакумаў»: «Ну вось, нарэшце і сумленне нацыі знайшлі — Р.Бярозкіна, які не хаваў сваёй антыпатыі да савецкай улады, за што, паводле тагачасных законаў, і пагарэў. Нармальныя законы або ненармальныя — справа другасная. Ты можаш за імі не ісці, але тады ўжо не крыўдуй, калі цябе на 10 гадоў укатаюць.

Працяг на старонцы 11.

СЦІСЛА

### У МУС не каментуюць

інфармацыю аб звальненні начальніка гродзенскай міліцыі, генерал-маёра Генадзя Хацько. Адзін з гродзенскіх парталаў абвясціў, што абласная міліцыя працуе без начальніка ўжо некалькі тыдняў. Паводле звестак БелаПАН, цяпер Генадзь Хацько знаходзіцца на бальнічным.

### Ідэнтыфікаваныя асобы польскіх лётчыкаў

Верталёт Памежнай варты Польшчы разбіўся позна вечарам 31 кастрычніка. Яго абломкі знайшлі на беларускай тэрыторыі за 200 метраў ад лініі мяжы каля Высокага (Брэсцкая вобласць). Машына ад моцнага ўдару аб зямлю цалкам разбурылася.

**МБ; БелаПАН**




**Барацьба за вызваленне**

Выйшаў чарговы збор твораў у фундаментальнай серыі часопіса «ARCHE» — зборнік прац Антона Луцкевіча «Барацьба за вызваленне». Уклаў кнігу Анатоль Сідарэвіч.

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764
Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

В.Ш. з Віцебскага раёна.
Генадзю К., Дзмітру В., Леаніле Г. з Мінскага раёна.
Канстанціну К., Барысу Ч., Міхасю Б. з Магілёва.
Віктару С. з Лепельскага раёна.
Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёна.
Уладзіміру Ц. з Лагойскага раёна.
І.З., І.З. са Смалявіцкага раёна.
Чэславу В. з Ліды.
Фёдару К. з Талачынскага раёна.
В.Т. са Жлобінскага раёна.
Валерыі Д., Васілю К. з Гомеля.
Сяргею С. з Любанскага раёна.
А.Р. з Мастоўскага раёна.
Георгію С.з Бешанковіцкага раёна.
Ніне А., Ігару Дз., Сяргею А. з Брэста.
Анатолю Б. з Маладзечанскага раёна.
Аляксею Ш., А.А., Валерыі П., Алесю Б. з Баранавіцкага раёна.

# Хто заменіць Сідорскага?

**Называюцца прозвішчы Пятра Пракаповіча, Леаніда Анфімава, Сяргея Ткачова.**

Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта Уладзіміру Макею бліжэйшым часам падрыхтаваць прапановы па кадравых рашэннях адносна членаў урада. Гэта адбылося ў пятніцу 30 кастрычніка на нарадзе па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны сёлета і праектах прагнозу эканамічнага развіцця і бюджэту налета.

У той вечар Лукашэнка быў суровы. Дзяржаўныя тэлеканалы паказвалі, як ён у гневе называў чыноўнікаў лайдакамі.

«Краіна жыве так, як быццам крызісу ў краіне няма. На чым ездзілі, на тым і ездзяць. Куды ездзілі, туды і ездзяць. Што елі — тое ямо, што апранaлі — тое і апранаем», — цытуе Лукашэнку ягоная прэс-служба.

«Ніхто яшчэ ў крызісе не жыў, акрамя народа, якому толькі і прапаноўваюць то на 10 даляраў, то на 5 павысіць плацяжы па камуналцы, — па-папулісцку грымеў ён. — І не хадзіце да мяне, і не прасіце, маўляў, давайце гэта павялічым, тое паднімем. Шукайце шляхі зніжэння сабекошту. Працуйце над павышэннем прадукцыйнасці працы».

Кіраўнік дзяржавы даручыў старшыні Нацбанка Пятру Пракаповічу і намесніку кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леаніду Анфімаву ўзначаліць дапрацоўку дакументаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2010 год, якія рыхтаваў урад.

Пасля гэтай нарады чарговы раз загаварылі пра адстаўку прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага. Хто можа заняць пасаду кіраўніка ўрада?


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сідорскі пратрымаўся каля Лукашэнкі рэкордны тэрмін.**

«Змены ва ўрадзе могуць адбыцца вельмі хутка, яшчэ ў лістападзе, — кажа палітычны аглядальнік Раман Якаўлеўскі. — Відавочна, што Лукашэнка быў незадаволены вынікам перамоваў Сідорскага ў Маскве з Уладзімірам Пуціным, бо вынікаў не было ніякіх. Таму Сідорскі становіцца вось такой ахвярай. Лукашэнка рашуча адштурхнуў усе прапановы Сідорскага і Сямашкі. Я больш схіляюся да таго, што новым прэм'ерам можа стаць Леанід Анфімаў. Ён мае выдатную біяграфію — працаваў у Мінгарвыканкаме і Камітэце дзяржкантролю. Ягоны аўтарытэт у лукашэнкаўскім атачэнні таксама расце».

Акрамя безаблічнага Анфімава, называюцца і больш вядомыя народу прозвішчы.

«Можа адбыцца планавая змена прэм'ера напярэдадні выбараў. Цяжка сказаць, хто можа стаць новым кіраўніком урада. Найчасцей называецца прозвішча Пракаповіча, пазіцыі якога ўзмацняюцца, але ці хоча ён сам таго. Здаецца, ён больш хоча перакласці частку паўнамоцтваў урада на Нацбанк. Памочнік прэзідэнта Ткачоў таксама наўрад ці. Але важна, што Ткачоў змяніў свае артадаксальныя погляды. Можа быць Сямашка ці нехта зусім новы. Не важна, хто стане новым прэм'ерам, важна, ці застанецца стары курс у эканоміцы, ці будзе новы», — кажа палітолаг Віталь Сіліцкі.

Раман Якаўлеўскі робіць прагноз, што Сідорскага могуць прызначыць старшынёй Мінскага гарвыканкама. Пасада пустуе ад лета пасля звальнення па хваробе Міхаіла Паўлава. «Я асабіста накіраваў бы Сідорскага паслом у Маскву ці Кіеў, бо ён ведае гэтую працу, але наўрад Лукашэнка на такое адважыцца», — кажа Р.Якаўлеўскі.

ЗП

## БХД ставіць на Рымашэўскага, змагаецца з казіно

**Беларуская хрысціянская дэмакратыя на сваім устаноўчым з'ездзе вырашыла, што партыя будзе прымаць удзел у мясцовых і прэзідэнцкіх выбарах. У рэйтынгавым галасаванні Віталь Рымашэўскі перагнаў Аляксандра Мілінкевіча.**

Пасля першай адмовы ў рэгістрацыі хрысціянскія дэмакраты думалі, ці варта праводзіць яшчэ адзін устаноўчы з'езд. Мерапрыемствы не самае таннае, а тое, што зарэгіструюць, то невядома. Вырашылі — трэба паспрабаваць.

Месцам збору зноў стаў Палац культуры МТЗ. Праўда, каб атрымаць гэтае памяшканне, давялося пагразіць правядзеннем з'езда на Кастрычніцкай плошчы. Чалавек дзесяць так і прыйшло на цэнтральны мінскі плац.

На з'езд вольна акрэдытавалі прадстаўнікоў дзяржаўных СМІ. «Мы адкрытыя для ўсіх», — сказаў на гэта П.Севярынец. Не пабаяліся новай антыагіткі ад тэлеканалаў.

Чым уражваюць з'езды БХД, дык гэта тым, што на іх бачыш абсалютна новых людзей. Кіраўніцтву хадэкаў насамрэч удалося прывесці ў партыю незаангажаваных раней у палітыку.

Калі людзей пачалі запускаць у залу, то яны пабачылі два дзесяткі партыйных сцягоў, які луналі пад столлю. На экране быў бел-чырвона-белы сцяг з выявай Хрыста — прыдумка гомельскіх актывістаў. З калонак чулася «Армагедон, Армагедон» у выкананні гурту «Тэзаўрус», а таксама «Ты і я за Свабоду».

Агулам на з'езд сабралася 311 дэлегатаў, а таксама 332 госці. Сярод апошніх былі новапрызначаная пасол Вялікабрытаніі Размары Томас, а таксама пасол Венгрыі Ферэнц Контра.

На пераз'езд прыйшлі Станіслаў Шушкевіч і Аляксей Янукевіч. Мілінкевіча замяняў Віктар Карняенка. Затое прывітанне было перададзенае ад прэм'ер-міністра Літвы Андруса Кубілюса.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Павал Севярынец (злева) і Віталь Рымашэўскі.**

У сваім выступе Павел Севярынец казаў аб тым, што трэба змагацца з карупцыяй. Ён паабяцаў, што аборты і самагубствы перастануць быць нормай, калі БХД прыйдзе да ўлады.

Сустаршыня БХД кобрынец Георгій Дзмітрук упершыню прамаўляў па-беларуску. Ён гаварыў пра тое, што ва ўсіх суседніх краінах абвешчана барацьба з казіно і заламі гульнявых аўтаматаў, тады як у Беларусі гэта толькі набірае абароты. Дзмітрук прыгадаў паспяховую кампанію БХД супраць акультызму і заклікаў пачаць новую супраць казіно.

Ксёндз Юры Барок з Глыбокага назваў абсурдам словы, што хрысціянін не можа займацца палітыкай. Менавіта Барок напачатку працы з'езда чытаў малітву «Ойча наш» са сцэны.

Было ў зале і колькі п'яных правакатараў, якія пасля гукання «Жыве Беларусь» крычалі «Жыве, мазафака». Хлопцы з аховы хутка іх павыкідалі з залы. Аховай, дарэчы, кіраваў былы палітвязень і «краёвец» Вадзім Кабанчук, які нядаўна вярнуўся з эміграцыі. Ягоная маці Таіса, да слова, узначальвае Магілёўскую абласную арганізацыю БХД.

Парадаваў публіку «маскоўскі гастарбайтэр» Кастусь Жукоўскі з Гомеля, які настойваў на вылучэнні Віталя Рымашэўскага канчатковым кандыдатам ад апазіцыі. «Цяпер лесу няма, дроту калючага няма, а мы свайго кандыдата вылучыць баімся», — казаў К.Жукоўскі.

Праграмныя дакументы партыі былі прынятыя амаль тыя ж, што і ў лютым. Сустаршыні таксама засталіся ранейшымі — Павел Севярынец, Віталь Рымашэўскі, Георгій Дзмітрук і Аляксей Шэін.

Найбольш прынцыповым было пытанне фармату ўдзелу БХД у выбарах. «Калі прымаем нешта, то выконваем абавязкова», — сказаў П.Севярынец.

У мясцовых удзельнічаем да канца, вырашылі дэлегаты. Хоць той жа Севярынец быў за тое, каб абвясціць пра ўдзел, але з канчатковым фарматам вызначыцца пазней.

Георгій Дзмітрук сказаў: «Калі мы палітыкі, то мы павінны ўдзельнічаць. Нікога не цікавіць, якія правілы гульні. Гэта, як футбалісты, яны выходзяць гуляць і ў кепскае надвор'е, і калі суддзя куплены, бо гэта іх праца».

За тое, каб удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах, выказаліся амаль усе дэлегаты. Найбольш спрэчным было, ці ставіць на свайго кандыдата і не глядзець на іншых, ці ўсё ж удзельнічаць у агульных праймерыз, ці ўвогуле ўжо зараз зняць Рымашэўскага.

Вырашылі кандыдата ад БХД пакінуць, але пазмагацца з іншымі. Хто акажацца мацнейшым, той і будзе ўдзельнічаць у выбарах. Севярынец сказаў, што адзіны будзе вызначаны тым, у каго акажацца самая вялікая ініцыятыўная група.

Напрыканцы адбылося рэйтынгавае галасаванне, каго сябры БХД могуць падтрымаць на наступных прэзідэнцкіх выбарах. Прычым галасаваць можна было за некалькіх кандыдатаў.

У выніку В.Рымашэўскі атрымаў 201 голас, А.Мілінкевіч — 131, З.Пазняк — 97, А.Казулін — 36, А.Лукашэнка — 3.

Адзін дзядуля пасля гэтага галасавання крычаў: «Жанчынку трэба! Дзе Тэтчэр? Дзе Меркель? Няма жанчынкі. Толькі жанчынка нешта зможа змяніць».

А скончыўся з'езд, як і пачынаўся, малітвай.

**Зміцер Панкавец**

### СЦІСЛА

#### Лукашэнка ляціць ва Украіну

Аляксандр Лукашэнка 5—6 лістапада наведае Украіну з афіцыйным візітам. Апошні раз Лукашэнка і Ючшанка сустракаліся 9 кастрычніка на саміце СНД у Кішынёве.

#### Рыгоні замянілі на Хурскайнен

Фінскі дэпутат Сініка Хурскайнен стала новым спецдакладчыкам Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы па Беларусі. Прызначэнне адбылося яшчэ ў верасні. Ад лютага 2007 года гэтую пасаду займаў італьянскі парламентар Андрэа Рыгоні, яшчэ раней — кіпрыёт Хрыстас Пургурыдэс. Хурскайнен нарадзілася ў 1951 годзе. Прадстаўляе сацыял-дэмакратычную партыю. Ад студзеня 2008 года ўзначальвае падкамітэт ПАРЕ па Беларусі.

#### Фіньკевіча забіраюць у войска

28 кастрычніка на імя лідэра «Маладой Беларусі» А.Фіньkevіча прыйшла павестка з'явіцца ў ваенкамат «на мерапрыемствы прызыву». Артур мае дзве судзімасці — артыкул 339 частка 2 «Злоснае хуліганства» і артыкул 415 «Ухіленне ад адбыцця пакарання ў выглядзе абмежавання волі». Як правіла, раней судзімых у войска не бралі.

ЗП

# Паніка на аўтарынках



PHOTO.BYMEDIA.NET

Аўтагоншчыкі «Ждановіч» распрацілі плечы.

**Бізнэс устурбаваны ўніфікацыяй мытаў з Расіяй.**

Большасць незалежных эканамістаў сумняваліся, што 28 кастрычніка прынясе заўважныя змены ў цэнніках. Пастанова №141 аб вызваленні цэнаў накіравана на будучыню, а не імгненныя змены. Так і адбылося. Цэны замерлі на ранейшым узроўні.

Па-першае, рабіць пераацэнку тавару складана, таму старыя партыі прадаюцца па ранейшых коштах. Новыя цэны могуць з'явіцца пасля закупак новых партый. Па-другое, шмат хто з прадпрымальнікаў і раней не даводзіў надбаўку на прадаваныя тавары да 30%, таму адмену абмежаванняў яны сустрэлі абыякава.

### Ждановічы — цэнтр лагістыкі

Адміністрацыі дробных мінскіх рынкаў, такіх як «Чэрвеньскі» ці «Заходні», мяркуюць, што іх кірмашы не зробяць рэвалюцыі мінскага маштабу, і спасылаюцца на гандлёвы цэнтр «Ждановічы», які сустракае наведнікаў старымі коштамі. Маўляў, калі там цэны нязменныя, то нашыя прадаўцы тым больш не рызыкнуць штосьці змяняць.

Цэны на Камароўцы маюць сезонны характар. Таму, напрыклад, за хурму, якая ўсё таннее і таннее, пастанове №141 дзякаваць няварта.

### Напалоханыя Мытным саюзам

А вось аўтамабілі даражэюць. Рынак ажыў са з'яўленнем попыту на машыны. Людзі напалоханыя чуткамі пра хуткую ўніфікацыю мытаў, з-за чаго аўтамабілі могуць падаражэць на 15—20%.

Дырэктар Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Людміла Шабанава мяркуе, што тады і б/у машыны падаражэюць на тыя ж працэнты, бо прадаўцы заўсёды арыентуюцца на сярэднія кошты ў дылераў.

Інтэрнэт перапоўнены аб'явамі: «купляйце хутчэй — цяпер мыта абыдзецца вам у 1620 еўра, а пасля новага года — 5805 еўра». Імаверна, гэта гульня прадаўцоў на боязі насельніцтва, але думка большасці наведвальнікаў сайта буйнейшага аўтарынка «Аўтамалінаўка» зводзіцца да меркавання: «У нашай краіне, калі нешта дрэннае можа адбыцца — адбудзецца. Калі мыты не паднімуць — будзе вялікі сюрпрыз, але ў казкі не верыцца».

Людзі напалоханыя яшчэ і інфармацыяй пра тэрміновы ўвоз партыі з 400 аўтамабіляў Volkswagen. Яшчэ больш дылеры меліся імпартаваць у лістападзе. З гэтага насельніцтва адразу ж зрабіла выснову, што аўтадылеры атрымалі нейкую патаемную інфармацыю і хочуць увезці як мага больш машын па малым мыце.

Артур Кавальчук — гандляр з той «Аўтамалінаўкі». «Я і мае знаёмыя прадаем машыны па старых цэнах. Іншая рэч, што цяпер наведвальнікаў на рынку стала нашмат больш. Як і летась, пад Новы год людзі кідаюцца ў чэргі за машынамі. Але лішніх грошай у пакупнікоў няма, таму яны гандлююцца за кожны дзесятак даляраў», — расказвае ён.

Ажыятаж на рынку аўтамабіляў чакаецца да таго часу, пакуль дзяржава не створыць пэўнасць у сітуацыі з мытамі.

**Ягор Марціновіч**

## Чаму беларускія сшыткі саступаюць расійскім

**Пастанова Міністэрства інфармацыі абмяжоўвае вытворцаў у дызайне вокладак.**

Выбар сшыткаў у кнігарнях вялікі, але ўсе расійскай вытворчасці. Толькі на вуліцы ў палатцы ля кнігарні пабачыў пару дзесяткаў сшыткаў гомельскай фабрыкі «Палесдрук». Чаму нашае горшае?

На фабрыцы тлумачаць, што якасць паперы ў сшытках такая, бо прадпрыемства купляе сыравіну ў Расіі, ды яшчэ і з накруткамі дылераў. Вось і выбіраецца самая танная. Чаму ў нас не перапрацоўваецца лес? А дзе? Добруш — раней гэта быў найбуйнейшы пераапрацоўчы камбінат у Беларусі — зачынены. Барысаў — ледзь ліпіць.

Наконт дызайну сшыткаў на «Палесдруку» паведамляюць, што існуе пастанова Міністэрства інфармацыі, у якой напісана, што друкарская прадукцыя, прызначаная для школы, не павінна мець кідкіх вокладак, бо гэта адцягвае ўвагу дзяцей ад навучальнага працэсу.

Раней прадпрыемства «Палесдрук» належала Міністэрству інфармацыі, у красавіку 2004 г. яго акцыянавалі: 98% акцый належала дзяржаве, у асобе таго ж Мініінфармацыі, а 2% — працаўнікам «Палесдрука». А сёлета кантрольны пакет перадалі пад кіраванне камунальна-абласной уласнасці галоўнага ўпраўлення ідэалогіі Гомельскага аблвыканкама. Прычым у Міністэрстве кожнае такое прадпрыемства курыравалі чатыры чалавекі, якія займаліся бухгалтэрыяй, збытам, маркетынгам і г.д. У аблвыканкаме такіх людзей няма, і «Палесдрук» застаўся сам са сваімі праблемамі.

Зараз разглядаецца пытанне аб перадачы акцый гораду. Але каму? Гарвыканкаму? Як у народзе кажуць — з хворай галавы на здаровую.

**Янка Клён, Гомель**

## Улады прадаюць «Белпрамбудбанк» Грэфу

Старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч акрэсліў фінансавую палітыку. У чарговы раз ён паспрабаваў супакоіць насельніцтва, давёўшы, што ў бліжэйшы час дэвальвацыі не будзе. Будаўніцтва застаецца прыярытэтным кірункам развіцця эканомікі. Планы на 2010 год змяшчаюць 8 мільёнаў квадратных метраў жылля.

Па словах Пракаповіча, ужо ў бліжэйшы час будуць прададзеныя два банкі. «БПС-Банк» (колішні «Белпрамбудбанк») аддадуць расійскаму «Сбербанку» ўжо ў гэтым месяцы, а вось «Белінвестбанк» пачакае пакупнікоў з Захаду максімум да наступнага лета. Нямецкі «Камерцбанк» узважыў за і супраць і ад першапачатковай ідэі адрокся. Ідэі продажу пакетаў акцый двух найбуйнейшых банкаў — «Беларусбанка» і «Белаграпрамбанка» — не знайшлі падтрымкі ва ўладаў.

У бліжэйшыя тыдзень-два пачнуць зніжацца банкаўскія працэнтныя стаўкі, а пасля і стаўка рэфінансавання. Мэта на наступны год — давядзенне працэнтных ставак па рублёвых крэдытах да 15% гадавых.

Вырашана, што павелічэння ПДВ з 18% да 20% з 2010 года не будзе. Прапанова адпраўленая на дапрацоўку.

**ЯМ**

## Валютныя хвалі

**Месяц росту еўра змяніўся тыднем пад'ёму даляра.**

У сярэдзіне мінулага тыдня суадносіны еўра і даляра дасягнулі псіхалагічнай мяжы ў 1,5 і нават перайшлі яе. Але радасць сярод нешматлікіх аматараў еўрапейскай валюты была нядоўгай. Паведамленні пра магчымасць перагляду грашова-крэдытнай палітыкі ЗША падтрымалі даляр.

За час узлёту еўра нават паспеў выйсці за 10%-ны калідор ад часоў дэвальвацыі. Але дабраўшыся да рэкорду ў 4079,29 рублёў, еўрапейская валюта пахіснулася і паваліілася ўніз. За тры дні падзенне склала 35 рублёў.

Даляр жа наадварот, дабраўшыся да дзевяцімесячнага антырэкорду ў 2713 рублёў, рвануў наверх, скарачаючы адлегласць да еўрапейскай валюты. Тры дні далі 20 рублёў росту. Паніка сярод насельніцтва, якое па старой звычцы ўсё яшчэ адкладвае грошы ў амерыканскай валюце, змянілася асцярожным спадзяваннем, а раптам даляр яшчэ пастаіць за сябе? Цяпер суадносіны дзвюх асноўных валют трымаюцца на ўзроўні 1,46-1,49.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Даляр — 3100?

Дэкан эканамічнага факультэта БДУ прафесар Міхаіл Кавалёў паведаміў, што курс даляра на наступны год запланаваны на ўзроўні 3100 рублёў.

### «Амкадор» скупляе заводы за мяжой

ААТ «Амкадор» набыў бранскі завод «Энергазапчастка», які з'яўляецца вытворцам запасных частак для цеплаэнергетычнага абсталявання. Гэта дазволіць больш актыўна прасоўваць прадукцыю «Амкадора» на расійскі рынак. Раней беларуская кампанія купіла завод сельскагаспадарчага машынабудавання ў раёне Вільні.

### Мільярд праз непамятлівасць

Кампанія Pepsi выплаціць $1,26 мільярда двум жыхарам ЗША. Тыя звярнуліся ў суд з пазовам, які быў задаволены. Гаворка ідзе пра аўтарскае права на адну з ідэй, дзякуючы якой выраслі прыбыткі кампаніі. Непрыемнасці можна было б пазбегнуць, калі б прадстаўнікі Pepsi з'явіліся ў суд. Але сакратарка кампаніі забылася пра яго і не папярэдзіла. Pepsi паабяцала не караць непамятлівую супрацоўніцу.

### Агаворка коштам $465 мільёнаў

Навіна пра тое, што Daimler падала заяўку на пакупку дадатковых 5% акцый «Камаза», выклікала хвалю ажыятажу на біржы. За гадзіну каціроўкі аўтакампаніі падаражэлі на 28,26% ці на $465 мільёнаў. Неўзабаве высветлілася, што словы старшыні Федэральнай антыманапольнай службы Расіі Ігара Арцем'ева былі зразуметыя няправільна. Інфармацыя датычылася іншай прапановы Daimler.

**ЯМ**

# Ірына Абельская зноў узначаліла Лечкамісію


На рагу Ульянаўскай і Энгельса ў самым цэнтры Мінска ўзводзіцца новы корпус Прэзідэнцкай бальніцы.

АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

**Ірына Абельская ў панядзелак была прызначаная галоўным доктарам Рэспубліканскай бальніцы ўпраўлення справамі прэзідэнта, паведамілі «НН» ў даведцы гэтай установы.**

Апошнімі днямі хадзілі размовы, што Абельская можа ўзначаліць цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі ў Бараўлянах. Тым не менш, на месца акадэміка Іосіфа Залуцкага паставілі Аркадзя Ларыёнава, які да гэтага ўзначальваў Лечкамісію.

Абельская ўжо працавала галоўным урачом у Лечкамісіі, але была звольненая ў красавіку 2007 года. Яшчэ раней яна была асабістым лекарам Аляксандра Лукашэнкі. Пасля надоўга знікла з поля зроку людзей. Цяпер вось дакторку вярнулі на старое месца.

**Зміцер Панкавец**

# ТОП-100 самых паспяховых і ўплывовых бізнэсмэнаў Беларусі

**Яго падрыхтавала электронная газета «Ежедневник».**

Рэйтынг гэты даволі ўмоўны і часам выпадковы, бо ніякіх аб'ектыўных звестак у яго аснове няма. Тым не менш, ён выклікае традыцыйную цікавасць. А частка яго ўдзельнікаў нервова паціскае плячыма, не радая такой бясплатнай рэкламе.

Абавязковая ўмова траплення ў топ-100 — публічнасць бізнэсмэна. Умовай пападання была наяўнасць на тэрыторыі Беларусі не менш за 25% усіх актываў або праектаў, а таксама пэўная ступень уплывовасці. Па гэтай прычыне, напрыклад, у топ-100 апынуліся Макараў, Брынцалаў і інш. Але, напрыклад, у Мікалая Лагуна ўзровень лакалізацыі бізнэсу ў Беларусі ў дачыненні да ўсіх яго актываў не настолькі высокі, як у папярэдніх персон.

**1. Уладзімір Пефціеў**, 52 гады, Мінск, у бізнэсе з 1993, заснавальнік УП «БТ Тэлекамунікацыі», старшыня агульнага сходу акцыянераў ЗАТ «Белтэхэкспарт».

**2. Юры Чыж**, 47 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1992, генеральны дырэктар ТАА «Трайпл», старшыня назіральнае рады ЗАТ «ФК Дынама-Мінск».

**3. Анатоль Цернаўскі**, 59 гадоў, Масква / Мінск, у бізнэсе з 2001 (у РБ), генеральны прадстаўнік ГК «Юнівест» па краінах СНД, старшыня рады дырэктараў ТАА «Мкд Груп» (Расія), член рады дырэктараў ААТ «ГрандІнвестбанк» (Расія).

**4. Сяргей Касцючэнка**, 55 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1989, старшыня праўлення ААТ «Прыёрбанк».

**5. Аркадзь Добкін**, 49 гадоў, Лоўрэнсвіль (Нью-Джэрсі, ЗША) / Мінск, у бізнэсе з 1993, прэзідэнт і старшыня савета дырэктараў EPAM Systems.

**6. Віталь Гарбузаў**, Арнштат (Германія) / Мінск, у бізнэсе з 1989, старшыня рады дырэктараў FENOX Automotive Components Gmbh.

**7. Павел Тапузідзіс**, Мінск, у бізнэсе з 1997, старшыня праўлення ТАА «Табак-Інвест».

**8. Віктар Шаўцоў**, 45 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1994, член назіральнае рады ЗАТ «Траст-банк», член праўлення ЗАТ «Белзарубежбуд».

**9. Аляксандр Машэнскі**, 39 гадоў, Брэст, у бізнэсе з 1993, генеральны дырэктар СП ТАА «Санта-Імпекс Брэст».

**10. Алег Хусаенаў**, 54 гады, Мінск, у бізнэсе з 1991, генеральны дырэктар, член рады дырэктараў ТАА «Міжнародны аўтамабільны холдынг Атлант-М», старшыня назіральнае рады ЗАТ «Мінскі транзітны банк».

**11. Сяргей Ткачук**, Мінск, у бізнэсе з 1992, саўладальнік Retail Trading Logistics Holdings, старшыня малое назіральнае рады дыстрыб'юцыйна-лагістычнага напрамку групы.

**12. Мікалай Мартынаў**, 52 гады, Віцебск, у бізнэсе з 1991, генеральны дырэктар СТАА «Марка».

**13. Андрэй Герашчанка**, Мінск, у бізнэсе з 2004, саўладальнік СТАА «Новая Супра» і СТАА «ЦДК».

**14. Аляксандр Мураўёў**, Вена / Мінск, у бізнэсе з 1993 (2-і этап — 2001), дырэктар ATEC Holding Gmbh, старшыня назіральнае рады ATEC Handelsgesellschaft.

**15. Аляксей Жукаў**, Мінск, у бізнэсе з 1996, генеральны дырэктар ГК «Алютэх».

**16. Юры Авяр'янаў**, Мінск, у бізнэсе з 1987, старшыня праўлення ЗАТ «Гандлёвы свет «Кальцо», старшыня праўлення ЗАТ «Ростэм».

**17. Аляксандр Садавой**, Мінск, у бізнэсе з 1993, намеснік старшыні агульнага сходу акцыянераў ЗАТ «Белтэхэкспарт».

**18. Ларан Арыніч**, 73 гады, Пінск, у бізнэсе з 1991, генеральны дырэктар ЗАТ «Холдынгавая кампанія «Пінскдрэў», член назіральнае рады ААТ «Белзнешэканамбанк».

**19. Сяргей Касцевіч**, Нікосія (Кіпр) / Масква / Мінск, у бізнэсе з 1990, прэзідэнт і генеральны дырэктар ASBIS Enterprises Ltd.

**20. Сяргей Ляўцееў**, 54 гады, Прага (Чэхія) / Мінск, у бізнэсе з 1993, генеральны дырэктар СП ЗАТ «Міжнародны дзелавы альянс» (IBA Group).

**21. Валерый Яляеў**, 62 гады, Мінск, старшыня Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту.

**22. Валеры Жалязоўскі**, 41 год, Санкт-Пецярбург/Мінск, у бізнэсе з 1991, член рады дырэктараў ТАА «Кіруючая кампанія «Керамір».

**23. Яўген Шыгалаў**, Мінск, у бізнэсе з 1993, старшыня рады дырэктараў ТАА «Гандлёвы дом «Ждановічы».

**24. Бірэндра Махата Нікасія** (Кіпр) / Мінск, у бізнэсе з 2001 (у РБ), член рады дырэктараў ААТ «Амкадор».

**25. Валеры Шумскі**, Масква / Мінск, саўладальнік ЗАТ «Юкола».

**26. Ігар Чарняўскі**, Мінск, у бізнэсе з 1990, генеральны дырэктар ТАА «НТС».

**27. Аляксандр Зарыбка**, 47 гадоў, Масква / Мінск, у бізнэсе з 2005 (у РБ), генеральны дырэктар ГК «Алмі», член рады дырэктараў ААТ «Вікторыя Група кампаній» (Расія).

**28. Дзмітрый Дзічкоўскі**, Рыга / Мінск, у бізнэсе з 1995, старшыня рады дырэктараў Silvano Fashion Group (Эстонія), старшыня назіральнае рады і генеральны дырэктар СП ЗАТ «Мілавіца».

**29. Сяргей Літвін**, Вільня / Мінск, у бізнэсе з 1993, саўладальнік ГК «Еўрагандаль».

**30. Ігар Макараў**, 47 гадоў, Масква / Мінск, у бізнэсе з 1997 (у РБ), старшыня рады дырэктараў МГК «Ітэра», старшыня рады дырэктараў ТАА «Нафтагазавая кампанія «Ітэра», старшыня рады дырэктараў ААТ «Ітэраінвестбуд».

**31. Уладзімір Япрынцаў**, 48 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1992, намеснік генеральнага дырэктара ТАА «Трайпл».

**32. Анатоль Арцюхоўскі**, Мінск, у бізнэсе з 1994, дырэктар ЗАТ «Мінскі завод безалкагольных напояў».

**33. Сяргей Савіцкі**, 43 гады, Кіеў / Мінск, у бізнэсе з 1991, член рады дырэктараў, генеральны дырэктар ТАА «Міжнародны аўтамабільны холдынг «Атлант-М» ва Украіне.

**34. Аляксей Ваганаў**, 49 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1990, генеральны дырэктар СП ЗАТ «Лада ОМС Холдынг», старшыня рады акцыянераў СП ЗАТ «Юнісан».

**35. Аляксандр Цэнтнер**, 43 гады, Мінск, у бізнэсе з 1993, генеральны дырэктар ГК «А-100», намеснік дырэктара па перспектыўным развіцці УП «Дамаан».

**36. Іван Буракоўскі**, Мінск, у бізнэсе з 1992, дырэктар ТАА «АП НІІ ПКД».

**37. Аляксандр Шакуцін**, 50 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1997, старшыня рады дырэктараў ААТ «Амкадор», намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Праммедінвест».

**38. Юры Зісер**, 49 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1992, генеральны дырэктар НВПУП «Надзейныя праграмы» (партал TUT.by).

**39. Вячаслаў Доўнар**, Мінскі р-н, у бізнэсе з 1986, генеральны дырэктар ТАА «Белінтэртранс».

**40. Веніямін Рэйман**, Віцебск, у бізнэсе з 1992, дырэктар ААТ «Веста».

**41. Дзмітры Розум**, Мінск, 1992, генеральны дырэктар СТАА «Аўтабізнэс».

**42. Уладзімір Лапанік**, Мандэлейн (Ілінойс, ЗША) / Мінск, у бізнэсе з 1993, кіраўнік прадстаўніцтва Tsyn Group у Беларусі, старшыня агульнага сходу членаў СТАА «Арэса-сэрвіс».

**43. Анатоль Цюцюноў**, 60 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1994, генеральны дырэктар ААТ «Керамін», старшыня ХК «Керамін-Мінск».

**44. Уладзімір Брынцалаў**, 62 гады, Масква / Мінск, у бізнэсе з 1994 (у РБ), прэзідэнт ЗАТ «Брынцалаў-А» (Расія).

**45. Ігар Мамоненка**, Мінск, у бізнэсе з 1994, генеральны дырэктар ЗАТ «Белхард Груп».

**46. Віктар Пятровіч**, Мінск, у бізнэсе з 1997, дырэктар ТАА «Табак-Інвест».

**47. Аляксей Лойка**, Мінск, у бізнэсе з 1999, саўладальнік RTL Holding, дырэктар ТАА «Тыбетрэй».

**48. Яўген Баскін**, Магілёў, у бізнэсе з 1994, дырэктар СЗАТ «Сервалюкс».

**49. Уладзімір Лахцянкоў**, Мінск, у бізнэсе з 1992, уладальнік SIS Group, генеральны дырэктар НВТАА «Сувязынфармсэрвіс».

**50. Віктар Цярэшчанка**, 71 год, Мінск, у бізнэсе з 1989, старшыня праўлення СП ТАА «Беліта», генеральны дырэктар ЗАТ «Вітэкс».

**51. Алег Бараноўскі**, Мінск, у бізнэсе з 1999, генеральны дырэктар ЗП «Белвілесдэн».

**52. Васіль Смятанін**, Масква / Мінск, у бізнэсе з 1992, саўладальнік ГК «Джэнці».

**53. Артур Зубарык**, Масква / Мінск, саўладальнік ЗАТ «Юкола», дырэктар ТАА «Сыравінныя рэсурсы-Бел».

**54. Уладзімір Васілёнак**, 44 гады, Мінск, у бізнэсе з 1993, саўладальнік ГК Dream Makers.

**55. Сяргей Барок**, 44 гады, Мінск, у бізнэсе з 1991, уладальнік СТАА «Завод вінаградных вінаў «Дыяніс».

**56. Анатоль Капскі**, 43 гады, Барысаў, у бізнэсе з 1996, генеральны дырэктар ААТ «БАТЭ», старшыня праўлення ТАА «ФК БАТЭ».

**57. Юлія Скарыніна**, Мінск, у бізнэсе з 1992, уладальніца ПУП «АСК Юліі Скарынінай».

**58. Мікалай Немагай**, Мінск, у бізнэсе з 1996, генеральны дырэктар ТАА «Грынтур».

**59. Алма Яунсямене**, Вільня / Мінск, у бізнэсе з 1999, саўладальніца СТАА «Лібрэцік» і УП «Навіта».

**60. Валеры Віркоўскі**, Мінск, у бізнэсе з 1992, старшыня праўлення СЗАО «БелАВМ», карпаратыўны дырэктар ЗАТ «Ітранзішэн»

**61. Мечыслаў Віткоўскі**, 55 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1990, генеральны дырэктар ВПУП «Рытм».

**62. Андрэй Астравух**, 47 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1991, генеральны дырэктар ТАА «Фабрыка інфармацыйных тэхналогій», старшыня рады заснавальнікаў ТАА «Вэб-Эксперт».

**63. Абда Рамэа Абдо**, 34 гады, Мінск, у бізнэсе з 1997 генеральны дырэктар ТАА «БНК-Інжынірынг».

**64. Сяргей Карэнька**, 53 гады, Мінск, у бізнэсе з 1991, генеральны дырэктар СТАА «Арэса-Сэрвіс».

**65. Юсэф Недал Амін**, Мінск, у бізнэсе з 1994, старшыня праўлення ТАА «Кравіра».

...

**72. Кшыштаф-Міхал Стэмпень**, Брэст, у бізнэсе з 2001 (у РБ), дырэктар ЗП ТАА «Інка-Фуд».

...

**83. Уладзімір Дзялендзік**, 57 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1992, генеральны дырэктар СТАА «Дарыда».

...

**87. Сяргей Атрошчанка**, 39 гадоў, Мінск, у бізнэсе з 1992, генеральны дырэктар ТАА «Серж».

...

**100. Мікалай Небышынец**, Мінск, у бізнэсе з 1994, генеральны дырэктар ТАА «Белмед-інфарм».

**Ежедневник**

# Слёзы Вікторыі Азаранкі



Як гартуецца наймацнейшы характар беларускага спорту.

2009 год стаў пакуль самым удалым у кар'еры 20-гадовай беларускай тэнісісткі Вікторыі Азаранкі. Сёлета яна ўпершыню выйграла тры турніры з серыі WTA, а ў рэйтынгу паднялася на рэкорднае шостае месца.

Гэта дазволіла ёй згуляць на выніковым турніры года ў катарскай Досе, дзе збіраюцца восем наймацнейшых тэнісістак свету. Нехта кажа, што гэта проста дарагая забаўка. Тым не менш, каб выйграць такі турнір, трэба атрымаць мінімум чатыры перамогі над прадстаўніцамі першай дзесяткі. Дзе яшчэ можна такое пабачыць?

Азаранка спачатку перайграла сербку Алену Янкавіч, а потым саступіла датчанцы Каралін Вазняцкі. У выніковай гульні за выхад з групы яна сустракалася з полькай Агнешкай Радванскай.

Віка без праблем выйграла першы сэт, у другім выйгравала 5:2, мела сваю падачу, і тут пачалося... Магчыма, дала пра сябе знаць старая недалечаная траўма спіны і сцягна. Азаранку было не пазнаць.

З пачаткам трэцяга сэта яна яўна не паспявала за ўкарочанымі мячамі полькі, а тая, адчуваючы слабасць суперніцы, біла мячы ў розныя канцы корта, яе можна зразумець.

Дактары некалькі разоў спрабавалі суцішыць боль — не дапамагала. Увесь свет (была жывая трансляцыя па «Еўраспорце») бачыў, як Азаранка плача, не можа стаяць на назе, але працягвае сціснуць з сябе ўсмешку і працягваць барацьбу. Цяжка сказаць, на што ў такім стане разлічвала беларуска, бо адчувалася, з якім намаганнем ёй даваўся кожны розыгрыш.

Трыбуны, хоць у асноўнай масе і перажывалі за польку, апладысментамі сустракалі кожны выйграны Азаранкай мяч. Цудаў не адбылося — Віка прайграла. Але сваёй нязломнасцю пераканала, што яе галоўныя перамогі яшчэ наперадзе.

**Зміцер Панкавец**

## Студэнт з Брэста выйграў у «Спортлато 5 з 36» 766 мільёнаў

Прычым ён тры тыдні не аб'яўляўся, паведамілі ў ЗАТ «Спорт—пары».

Пераможца розыгрышу 105-га тыражу, які адбыўся 11 кастрычніка, атрымаў 766 млн 955 тыс. 510 рублёў.

«Гэты выйгрыш запомніўся тым, што не толькі быў разыграны самы буйны грашовы прыз у Беларусі, але і тым, што ўладальніка астранамічнай сумы давялося чакаць больш за тры тыдні», — адзначаецца ў інфармацыйным паведамленні кампаніі.

Пераможцам розыгрышу аказаўся 24-гадовы студэнт 5-га курса Брэсцкага тэхналагічнага ўніверсітэта. Як высветлілася, прычынай затрымкі ў атрыманні выйгрышу стала смерць блізкага сваяка.

Паводле словаў уладальніка рэкорднага выйгрышу, у яго быў дакладны план, на што ён зрасходуе грошы.

Студэнт перавёў некаторую суму ў два дзіцячыя дамы, затым набыў кватэру ў Мінску і новы аўтамабіль, а ўсю астатнюю частку патраціў на адраджэнне сямейнага бізнэсу.

У памяць пра свайго дзядулю, які быў вінаробам, унук набыў вінаграднікі ва Украіне.

Шэраг латарэй, сярод якіх «Спортлато», вядуць упартую барацьбу за прыцягненне ўдзельнікаў. А што больш прывабна, чым вестка пра шалёны выйгрыш...

**Мікола Бугай; на аснове інф. БелаПАН**

## Прададзена 3900 беларусак

Столькі ахвяраў гандлю людзьмі выяўлена з 2002 года.

Сёлета перакрытыя 57 каналаў пастаўкі беларускіх грамадзян для сэксуальнай эксплуатацыі ў 12 краінаў свету. Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі паведаміў Сяргей Калтун, намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі МУС.

Спынена дзейнасць дзевяці арганізаваных злачынных груп.

Унутры краіны спынена дзейнасць дзвюх арганізаваных груп, якія кантралявалі прастытуцыю ў Магілёве і Брэсце. Затрымана 7 чалавек. Іх справа разглядаецца ў судзе.

Таксама ў гэтым годзе выяўлена ўжо 127 злачынцаў, звязаных з вытворчасцю і распаўсюдам дзіцячай парнаграфіі. Спынена дзейнасць 9 порнасайтаў, ліквідавана 2 порнастудыі па вытворчасці і тыражаванню порнапрадукцыі. 2 красавіка вынесены судовы выраку ў адносінах да міжнароднай злачыннай групы, на чале якой стаялі грамадзяне Расіі. На працу некалькіх гадоў злачынцы здымалі і вывешвалі ў інтэрнэт порна з удзелам непаўналетніх хлопчыкаў. Яны асуджаныя на розныя тэрміны: ад трох да сямі гадоў пазбаўлення волі, з канфіскацыяй маёмасці.

З 3900 ахвяраў гандлю людзьмі большасць атрымала рэабілітацыйную і інтэграцыйную дапамогу ў міжнародных і беларускіх недзяржаўных арганізацыях.

**Настасся Шамрэй**

## Грашовыя пытанні перапісу

Студэнтам—перапісчыкам заплацілі за працоўны час, а не за колькасць перапісаных. А як кампенсаваць змарнаваныя дні студэнтам—платнікам?

Супрацоўнікі Белстата радасна адрапартавалі, што перапіс насельніцтва скончыўся і перапісаныя 99,7% гаспадарак. Тым не менш, на паверхні застаўся шэраг фінансавых пытанняў. Абсалютную большасць перапісчыкаў склалі студэнты. Дзяржава абавязалася выплаціць ім па 140 тысяч рублёў за 22 дні працы.

### Грошы на вецер

— Я паспела перапісаць каля 90% кватэр, але ў перадапошні дзень перапісу захварэла. Мне выдалі бальнічны. Калі пра гэта даведалася кіраўніцтва ўчастка, то яны хуценька зрабілі пераразлік. Замест 140 я атрымаю 105 тысяч — адну базавую велічыню мне не выплацяць, — расказвае студэнтка-перапісчыца Настасся.

Белстат тлумачыць: перапісчык павінен быў працаваць штодзень. За гэта ён і атрымлівае грошы. А колькі працэнтаў працы ён робіць — другаснае пытанне.

Яшчэ адна праблема звязаная са студэнтамі-платнікамі: ніхто не збіраецца кампенсаваць ім наперад аплочаныя і прапушчаныя заняткі. Калі кошт года навучання перавышае $1500, то 22 дні перапісвання — каля 300 тысяч рублёў...

У бухгалтэрыі БДУ літаральна смяюцца: «Ніякага пераразліку ў нас не будзе! Няхай факультэты арганізуюць прапушчаныя заняткі». Але зразумела, што калі выкладчыкі ўжо правялі заняткі з тымі студэнтамі, якія не ўдзельнічалі ў перапісе, яны не будуць паўтараць тое самае бясплатна яшчэ і для другой часткі курса. Калі ж аплачваць працу выкладчыкаў — бюджэт універсітэта не сыдзецца.

### Як дабівацца праўды

Юрыст Валянцін Стэфановіч раіць адштурхоўвацца ад дамовы, якую заключалі студэнты-платнікі са сваімі навучальнымі ўстановамі. Калі там сказана, што абавязак універсітэта — арганізацыя навучальнага працэсу, то ВНУ адказнае за невыкананне дамовы.

**Ягор Марціновіч**

## СЦІСЛА

### «Ляпісы» — лаўрэаты расійскіх узнагарод

Гурт «Ляпіс Трубяцкой» стаў трыумфатарам найбуйнейшых расійскіх альтэрнатыўных прэмій «RAMP». Гурт перамог у дзвюх намінацыях: «Гурт года» і «Кліп года» («Агеньчыкі»). Прыз «Ляпісам» уручаў лідэр шатландскай групы Franz Ferdinand Алекс Капранас.

### Генадзь Бураўкін шпіталізаваны

Пасля чарговай працэдуры ў Рэспубліканскай бальніцы Кіраўніцтва справаў прэзідэнта па дарозе дамоў 73-гадовы пісьменнік адчуў сябе кепска і вярнуўся ў клініку. Тут яго паклалі ў аддзяленне рэанімацыі, адкуль 31 кастрычніка перавялі ў кардыялагічнае аддзяленне бальніцы. Да канца тыдня паэт плануе выпісацца з клінікі.

### Новы год з князем Вітаўтам

Турпрадпрыемства «Краіна замкаў» распрацавала экскурсію «Раство і Новы год з князем Вітаўтам». Экскурсія дазваляе адзначыць зімнія святы ў сярэднявечных традыцыях. Яна праходзіць праз Рубяжэвічы, Івянец і Ракаў. У Івянцы адбываецца кульмінацыйная падзея анімацыі — штурм замка крыжакоў. Пасля перамогі адзначаецца прыход зімніх свят: удзельнікі экскурсіі частуюцца нацыянальнымі стравамі, слухаюць сярэднявечную музыку і развучваюць танцы таго часу.

### Мега-Джаконда

Мегаламанія — рэч заразная.



Асабліва ў Брытаніі з яе Стоўнхенджам. Сёлета ў ангельскім мястэчку Рэксхэм мясцовыя мастакі намалявалі Мону Лізу памерам у 240 кв. м., змясціўшы яе на пляц пасярод гандлёвага цэнтра.

У маляванні ўзялі ўдзел 250 мастакоў, якія агулам напрацавалі 987 гадзінаў і выдаткавалі 86 літраў фарбы.

### 100 грамаў — і мабільнік запрацуе

Samsung зацікавіўся зарадавымі прыстасаваннямі, якія працуюць на аснове спірту. Пра гэта паведамілі прадстаўнікі кампаніі Viaspace, якая займаецца распрацоўкай такіх прыстасаванняў.

Зрэшты, пакуль што першапраходцам застаецца Toshiba, якая нядаўна выпусціла партатыўнае зарадавае прыстасаванне, якое працуе на метылавым спірце. Пакуль што навінка прадаецца толькі ў Японіі і каштуе $325.

Прыстасаванне можа цалкам зарадзіць два тэлефоны, пасля чаго ў яго неабходна заліць спірт са спецыяльнага картрыджа.

**ЛК, КМ, ЯМ; БелаПАН, Onliner.by**

# Эпідэмія панікі

Марлевыя павязкі, аксалінавая мазь і супрацьвірусныя лекі — вось за чым на працягу апошніх дзён стаяць у чэргах беларусы. Людзям у засцерагальных масках на вуліцах ніхто ўжо не здзіўляецца. У бальніцах не хапае месцаў, а адсутнасць хоць якой-кольвек інфармацыі падвышае паніку. Афіцыйна — у Беларусі няма эпідэміі грыпу, але людзі, здаецца, перасталі верыць.



Паніка бывае больш разбуральнай за эпідэмію.

### Пачалося з Украіны

Масавая істэрыя пачалася напярэдадні ва Украіне. Прырода віруса, які выклікае пнеўманію і смерць, пакуль дакладна не ўстаноўленая.

Па стане на 28 кастрычніка ахвярамі эпідэміі сталі 7 чалавек, але ўжо 29-га, у чацвер, зафіксавана больш за 20 ахвяраў, у пятніцу — 30, у суботу — каля 40... Вірус, які пачаўся ў Львоўскай, Івана-Франкоўскай, Цярнопальскай абласцях, хутка распаўсюдзіўся на рэшту краіны. Пачалася паніка. У Кіеве чэргі ў аптэках скančаліся на вуліцах.

Прэзідэнт і прэм'ер-міністр Украіны паасобку наведалі эпіцэнтр эпідэміі. У суботу Юлія Цімашэнка звярнулася да народа з паведамленнем, што ў краіне звыш 150 тыс. хворых, але выяўлена менш за два дзясяткі выпадкаў заражэння свіным грыпам. Тым не менш, улады аб'явілі на тэрыторыі Украіны трэці, найвышэйшы, узровень пагрозы эпідэміі. У навучальных установах уведзены трохтыднёвы карантын, абвешчаная забарона на масавыя мерапрыемствы.

### Свіны грып або лёгачная халера?

Прэпарата «Таміфлю», які лічыцца найбольш эфектыўным ад свінога грыпу, ва ўкраінскіх аптэках няма. Не было яго і да пачатку эпідэміі. Дэпутат Іна Багаслоўская, якая збіраецца балатавацца ў прэзідэнты, заявіла ў адной з тэлепраграмаў, што ўлада хавае рэальнае становішча. Паводле яе словаў, ва Украіне пачалася эпідэмія «лёгачнай» халеры. Медыкі адзначаюць, што хвароба не нагадвае вірусную інфекцыю і, у прыватнасці, грып.

Прадстаўнікі ўлады пасмяяліся накont халеры. Юлія Цімашэнка лічыць, што сітуацыя ўскладнілася з-за таго, што распаўсюджанне свінога грыпу супала з масавымі захворваннямі звычайнай ВРВІ. Наогул, напярэдадні выбараў эпідэмія стала «казырнай картай» у руках украінскіх палітыкаў.

На дадзены момант ад віруса ва Украіне памёр 71 чалавек. Як і ў Беларусі, не хапае лекаў і прафілактычных сродкаў. У такой сітуацыі Рада бяспекі вырашае, ці варта ўводзіць надзвычайнае становішча ў краіне.

### Паніка ў Беларусі пачалася ў інтэрнэце

На мінулым тыдні ў інтэрнэт-суполцы minsk_by з'явіўся допіс пра тое, што ў Мінску зафіксаваныя першыя выпадкі смерці ад віруса A/H1N1. Нібыта два дыягназы ўжо дакладна пацверджаны: адзін чалавек памёр ад віруса у 2-й гарадской бальніцы і яшчэ адзін, 17-гадовы хлопец, у дзіцячай інфекцыйнай бальніцы. Таксама гаворка ішла пра некалькіх чалавек, дыягназ якіх чакаў пацверджання. Напярэдадні блогер sammy_belarus напісала, што дактары і медсёстры ў 5-й бальніцы ходзяць у масках. «Толькі што паведамілі, што тут, у рэанімацыі, памерлі ад A/H1N1 ці ад «свінога грыпу» два чалавекі: 30 і 37-мі гадоў. Яшчэ два змагаюцца за жыццё. Сімптомы: высокая тэмпература і ацёк лёгкага...» —напісала яна ў сваім блогу.

Літаральна праз суткі, 30 кастрычніка, Міністэрства аховы здароўя арганізавала прэс-канферэнцыю. Намеснік міністра Роберт Часнойць заявіў, што, паводле дадзеных, на 29 кастрычніка ў Беларусі зарэгістравана 38 выпадкаў A/H1N1, пры гэтым няма ніводнага смяротнага выпадку.

### Ананімныя крыніцы: людзі паміраюць ад невядомага вірусу

Нягледзячы на адсутнасць афіцыйнай інфармацыі, людзі пачалі казаць пра тое, што хворыя паміраюць ад атыповай пнеўманіі. Чым гэтая пнеўманія выклікана, дакладна невядома. Дактары расказвалі знаёмым і — ананімна — сродкам масавай інфармацыі, што смерці ад пнеўманіі ў Мінску фіксаваліся. І ў хворых, якія памерлі, пацвярджаўся свіны грып.

**У правераных у Польшчы 700 выпадкаў ВРВІ ў 185 знойдзены вірус A/H1N1. Пакуль не было ніводнага смяротнага выпадку.**

### Афіцыйныя крыніцы: эпідэміі няма

Пра каранцін улады не заявілі і ў аўторак. 3 лістапада Міністэрства аховы здароўя правяло чарговую прэс-канферэнцыю, на якой паведаміла, што афіцыйна пацверджана 59 выпадкаў захворвання на грып A/H1N13. У шэрагу школ на па ўсёй краіне вырашана працягнуць вакацыі.

Чуткі пра эпідэмію свінога грыпу Міністэрства аховы здароўя не пацвердзіла. Галоўная санітарная доктарка краіны Надзея Качан падкрэсліла, што няма нагоды для панікі ў сувязі са свіным грыпам. «У нашай краіне эпідэміі гэтага захворвання няма», — заявіла яна.

### Наступная — Польшча

Паніка ад усходніх суседзяў імкліва распаўсюджваецца на Захад. Колькасць хворых на звычайны грып у Польшчы расце з кожным днём. Як піша польская газета Dziennik, на тым тыдні захварэла 11 тысяч, а тыднем раней — 8 тысяч палякаў. Паводле Дзяржаўнага інстытута медыцыны, з правераных 700 выпадкаў ў 185 знойдзены вірус A/H1N1. Пакуль не было ніводнага смяротнага выпадку. У Польшчы эпідэмічны стан абвяшчаецца тады, калі колькасць хворых будзе складаць 100 на 100 тысяч чалавек.

1 лістапада прэзідэнт Украіны Віктар Ючшанка звярнуўся да лідэраў шэрагу краін і міжнародных арганізацый з просьбай дапамагчы ў пераадоленні эпідэміі. Такія лісты ён накіраваў лідэрам Расіі, Беларусі, Венгрыі, Польшчы, Румыніі, Славакіі, ЗША, а таксама прэзідэнту Еўрапейскай Камісіі і генсеку НАТО. «Існуе пагроза нацыянальнай бяспецы Украіны, якую мы не можам нейтралізаваць толькі ўласнымі сіламі», —напісаў ён. У адказ Сусветная арганізацыя аховы здароўя накіравала ва Украіну 300 тыс. камплектаў «Таміфлю».

Аляксандр Лукашэнка пакуль ніяк не адрэагаваў на зварот украінскага калегі, які і на сітуацыю ў Беларусі. Ніякіх заяваў ад афіцыйных уладаў не паступала. Грамадзянам краіны застаецца не паддавацца агульнай паніцы.

**Вольга Жарнасек**

**Лекі ад «свінога» грыпу не былі завезены загадзя**

Прэпарат ад свінога грыпу «Таміфлю», які гарантавана забівае A(H1N1), з'явіцца ў беларускіх аптэках ў найлепшым выпадку праз два тыдні. Пра гэта агенцтву «Інтэрфакс–захад» заявіў гендырэктар кампаніі ««Медвакс» Алег Стома.

АПЫТАННЕ НН

## Чым збіраюцца бараніцца мінчане

Удзень 3 лістапада колькасць людзей на вуліцах беларускай сталіцы заўважна паменшала. Ля Камароўкі не было звычайнага для гэтага часу ажыятажу. У выпадковых мінакоў мы запыталі, ці адчуваюць людзі паніку і як абараняюцца ад раптоўнай небяспекі вірусу. Ці варта казаць, што кожны трэці, хто спыняўся, быў у адмысловай павязцы.

**Дзяўчаты-школьніцы:** Так, паніка адчуваецца. Наогул, мы хацелі набыць у аптэцы аксалінавую мазь і таблеткі, але іх няма. Але мы ямо малінавае варэнне, лімоны, вітамін С.

**Група студэнтаў:** Зараз у аптэках цяжка дастаць мазі і павязкі. Няма нічога. Мы заходзілі ўчора, тры аптэкі абышлі і не знайшлі нічога.

**Жанчына з дзіцём:** Паніка адчуваецца. Мае дзеці на дадатковыя заняткі ходзяць у Палац дзяцей і моладзі, там дзяцей амаль няма — бацькі не пускаюць. І нават выкладчыкі нам казалі, што лепш дзецям у хаце пасядзець.

**Анжаліка, бухгалтарка:** Чуткі, вядома, ходзяць. Тэлефануюць знаёмыя, сваякі — пужаюць. Ёсць паніка.

Чым збіраюцца бараніцца мінчане ад заморскай хваробы? Як аказалася, праз дэфіцыт лекаў у аптэках людзі выкарыстоўваюць народныя метады, іншыя — спадзяюцца на зробленыя раней прышчэпкі:

**Аляксей, студэнт:** Ем сала, часнык, народныя метады выкарыстоўваю. Стараюся ў грамадскім транспарце прыкрываць твар.

**Надзея, вахцёрка:** Маскі ў першую чаргу, ну і ўсе прафілактычныя сродкі: часнык, цыбуля, ну і гартаванне, спартыўная хадзьба.

**Людміла, пенсіянерка:** Я чалавек ужо вопытны, напачатку кастрычніка мы з мужам зрабілі прышчэпкі ад вірусу тыпу А і В. А так — садавіна і абляпіха. І цяпер хаджу, спадзяюся, што грып пройдзе паўз мяне. Адзінае, што не магу прымусіць дзяцей зрабіць прышчэпкі ўнукам.

**ВЖ**

# Мінздароўя: Сітуацыя цалкам кантралюецца

«Мы кожны год адзначаем такі эпідаміялагічны ўздым. Сёлета гэта адбылося трохі раней, у сувязі з надвор'ем. Але мы да яго гатовыя. Ніякіх катастроф няма. Сітуацыя цалкам кантралюецца». Так выказалася наконт сітуацыі з грыпам у Беларусі Людміла Жылевіч, начальнік аддзела першаснай медычнай дапамогі Міністэрства аховы здароўя падчас прэс-канферэнцыі 3 лістапада.

Яна паведаміла, што сітуацыя па смяротнасці ад інфекцыйных захворванняў не перавышае парога мінулага года. На сёння памяншаецца і цяжар захворвання, і колькасць хворых, якім патрэбна больш інтэнсіўная тэрапія. «Так, ёсць высокі ўзровень захворвання. Гэта праблема, якая ёсць ва ўсім свеце, і мы, безумоўна, былі да яе гатовыя. Міністэрства зрабіла ўсё магчымае, каб медычная дапамога, якая насельніцтву будзе аказваца, праводзілася ў поўным аб'ёме», — адзначыла Л.Жылевіч.

Наконт праблемы недахопу масак у аптэках яна сказала: «Можа, я такая нераспешчаная, каб купляць маску ў аптэцы. Яе можна зрабіць самому з марлі. Вы можаце проста хустачкай абвязацца».

На іншыя пытанні пра грып, у тым ліку свіны, Людміла Жылевіч адмовілася адказваць, бо гэта не было тэмай прэс-канферэнцыі.

**Настасся Шамрэй**

АНЕКДОТ

### У сувязі з недахопам масак...

У сувязі з недахопам масак супрацоўнікі аптэк наймаюць бамжоў, каб тыя здымалі з целаў памерлых ад свінога грыпу людзей, якія валяюцца на вуліцах горада ўжо паўсюль. Інфа 100% ад правераных людзей, імён назваць не магу, інакш на іх пачнецца паляванне.

Так пажартаваў наконт панічных чутак аўтар блога vadim_thesis.livejournal.com

# Замоўчванне грыпу выклікала эпідэмію панікі

**Беларусь не першая краіна, якую накрыла хваля эпідэміі. Яе сцэнар усюды аднолькавы.**

Як даведалася «Наша Ніва» ад надзейнай крыніцы ў адной з мінскіх бальніц, у медычныя ўстановы горада прыйшоў ліст з указаннем увесці меры перасцярогі. У выніку ў бальніцах спынена наведванне хворых, узмоцненая пільнасць у прыёмных пакоях. Са звесткак гэтай крыніцы, па стане на пятніцу, 30 кастрычніка, у краіне зафіксавана 39 смерцяў, з іх 9 у Мінску, ад пнеўманіі.

Пазней Камітэт аховы здароўя Мінгарвыканкама пацвердзіў, што ў сувязі з павелічэннем колькасці хворых на грып і ВРВІ існуе план перапрафілявання аддзяленняў бальніц. «Прынята рашэнне не пускаць наведнікаў у бальніцы да стацыянарных хворых». Афіцыйна, аднак, каранцін не ўводзіўся.

З розных шпіталяў прыходзяць разрозненыя весткі, што там фіксаваліся смяротныя выпадкі. Канаюць пераважна маладыя людзі. Адпаведныя службовыя дакументы трапілі ў распараджэнне агенцтва БелаПАН.

Між тым, эпідэміёлагі працягваюць заяўляць, што ніякай эпідэміі ў краіне няма. Галоўная санітарная доктарка краіны Валянціна Качан заявіла агенцтву БЕЛТА, што ейная служба ўважліва адсочвае сітуацыю, і што ўсе хворыя на пнеўманію паспяхова праходзяць курс лячэння.

Адзіным выключэннем з маўчанкі стаў Драгічын. 2 лістапада галоўны доктар Драгічынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Міхаіл Стахейка ў інтэрв'ю радыё «Свабода» пацвердзіў інфармацыю пра раптоўную смерць 37-гадовай настаўніцы з Толкаўскай базавай школы.

«Яна памерла ад пнеўманіі. Больш дакладны дыягназ паставяць калегі ў Брэсце, куды мы накіравалі для аналізу неабходныя матэрыялы. Гаварыць яшчэ нешта дадаткова я не маю права».

Настаўнікі Толкаўскай БШ, з якімі таксама ўдалося пагутарыць, паведамілі, што ў пятніцу перад канікуламі настаўніца, пра якую гутарка, прыйшла на працу з прыкметамі прастуды, але правяла свае ўрокі і класную гадзіну. Да доктара звярнулася толькі на позняй стадыі хваробы.

У аўторак органы аховы здароўя пацвердзілі, што жанчына мела свіны грып.

Ва Украіне, дзе медычная статыстыка адкрытая, заяўлена пра больш чым 200 тысяч хворых на вострую вірусную інфекцыю. 71 чалавек памёр. У Беларусі органы аховы здароўя да аўторка афіцыйна заяўлялі, што смерцяў у выніку вірусных інфекцыі ці свінога грыпу не зафіксавана.

Пры гэтым у аўторак Міністэрства аховы здароўя праінфармавала, што за мінулы тыдзень, з 26 кастрычніка па 1 лістапада, у краіне зарэгістраваны 70 тыс. захворванняў на вострыя рэспіраторныя інфекцыі і грып. А ўсяго за ўвесь перыяд назірання з 5 кастрычніка гэтага года ў краіне зарэгістраваны 322 тыс. выпадкі ВРВІ. Гэта на 41% болей, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Пакуль зарана казаць, ці беларускія дактары маюць справу толькі са свіным грыпам, ці таксама з іншым варыянтам вірусной інфекцыі.

Характэрна толькі тое, што сёлетняя інфекцыя распаўсюдзілася надзвычайна рана як для грыпу і, у невялікай колькасці выпадкаў, дае сур'ёзныя ўскладненні ў выглядзе хуткацечных пнеўманій, ад якіх літаральна развальваюцца лёгкія.

Гэтыя сімптомы характэрныя акурат для грыпу свінога. Дактары падкрэсліваюць: ён выклікае цяжкія ўскладненні толькі ў невялікай колькасці выпадкаў.

Беларусь не першая краіна, якую накрыла хваля эпідэміі. Яе сцэнар усюды аднолькавы. Хутка ў людзей выпрацуецца імунітэт, і A/H1N1 адступіць. Аднак застануцца пытанні.

Замоўчванне грыпу выклікала эпідэмію панікі. Гэта пагоршыць сітуацыю. Вінаватая ў ёй сістэма татальнага інфармацыйнага кантролю і боязь ініцыятывы на ўсіх узроўнях. Гэта сістэмныя заганы.

Выглядае, што не да канца падрыхтаванай была і медычная сістэма краіны. Прэпарата «Таміфлю» ў дастатковай колькасці завезена не было, а менавіта ён патрэбны, каб ратаваць людзей з ускладненнямі.

Тым часам улады па завядзёнцы валяць з хворай галавы на здаровую — інтэрнэтныя сродкі масавай інфармацыі, якія, са словаў намесніцы міністра інфармацыі Ліліі Ананіч, «раздзімаюць ажыятаж».

«Сапраўды, у суседніх краінах абвешчана жорсткая эпідэміялагічная сітуацыя, але ў Беларусі нічога не адбываецца такога, што было б непадуладна нашай медыцыне. Так, ёсць захварэлыя, ёсць перабоі з лекавымі сродкамі, але калі сёння СМІ выклічуць усіх грамадзян нашай краіны ў аптэкі, то можна сабе ўявіць, што будзе з гэтымі аптэкамі, — сказала Лілія Ананіч, працягнуўшы, што няма ніякай патрэбы бегчы ў аптэкі і закупляць лекі. — Трэба весці здаровы лад жыцця, звычайна гадаваць дзяцей і хадзіць на працу, а медыкі будуць рабіць сваю справу», — падкрэсліла яна.

**Мікола Бугай**

## Сярод шпіталізаваных з пнеўманіяй — Алесь Бяляцкі

**Сітуацыя ў 3-й бальніцы г. Мінска, дзе знаходзіцца праваабаронца, «як падчас вайны».**

Для хворых на пнеўманію выдзелілі яшчэ адно дадатковае аддзяленне. Хворыя ляжаць нават на калідорах. Ложкаў не хапае, таму забіраюць крэслы ў сталоўцы і кладуць на іх матрасы. Цяпер на калідоры знаходзіцца 17 хворых. Харчаванне ў сталоўцы адбываецца стоячы.

Тым не менш, як адзначыў Бяляцкі, каранцін не аб'яўлены, бальніца свабодная для наведвальнікаў.

Бяляцкі — намеснік старшыні Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека.

**Вольга Жарнасек**


Т:НІГ ТЕЛ:2376295 29 ОКТ 2009 11:48 СТР2

МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Дзяржаўная ўстанова
«Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр эпідэміялогіі і мікрабіялогіі»
(РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі)
вул. Філімонава, 23, 220114, г. Мінск
Тэл.: (017) 267 32 67, факс: (017) 267 30 93
Р/р 3632963219003 у ф-ле № 527 «Белжилдор»
ААТ «ААБ Беларусбанк», код 254, УНП 100558032
E-mail: belriem@gmail.com http://www.belriem.org

МИНИСТЕРСТВО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Государственное учреждение
«Республиканский научно-практический центр эпидемиологии и микробиологии»
(РНПЦ эпидемиологии и микробиологии)
ул. Филимонова, 23, 220114, г. Минск
Тел.: (017) 267 32 67, факс: (017) 267 30 93
Р/с 3632963219003 в ф-ле № 527 «Белжилдор»
ОАО «АСБ Беларусбанк», код 254, УНП 100558032
E-mail: belriem@gmail.com http://www.belriem.org

28.10.2009 № 1-1/268
На № ______ ад ______

Заместителю Министра здравоохранения, Главному государственному санитарному врачу Республики Беларусь Качан В.И.

Начальнику УЗ «Городское клиническое патологоанатомическое бюро» Пучкову А.Ф.

Главному врачу Минского ГЦГЭ Германовичу Ф.А

О результатах исследования секционных материалов [redacted]

ДОНЕСЕНИЕ

В РНПЦ эпидемиологии и микробиологии 26.10.09 г из УЗ ГКПБ
г. Минска для исследования на вирус гриппа A(H1N1) поступил
секционный материал (фрагменты легких, головного мозга, трахеи,
толстой и тонкой кишок) [redacted] 36 лет, умершего 25.10.09. в 6
ГКБ г.Минска, проживавшего по адресу г.Минск, ул. Буденного, [redacted]
[redacted] Клинический диагноз: внегоспитальная двусторонняя
полисегментарная пневмония крайней степени тяжести.
Двусторонний парапневмонический плеврит.

Из доставленного материала приготовлена 10% суспензия.
Методом ПЦР в режиме реального времени с использованием набора
реагентов для идентификации вируса гриппа свиней A/H1
(«АмплиСенсInfluenza A/H1-swine-FL») исследована объединенная
суспензия легких и трахеи и суспензия фрагмента головного мозга. В
объединенной суспензии легких и трахеи выявлена РНК вируса гриппа
A/H1-swine. В суспензии головного мозга РНК вируса гриппа A/H1-
swine не выявлена.

Заключение: в объединенной суспензии легких и трахеи [redacted] выявлена РНК вируса гриппа A/H1-swine.

И.о. директора А.С. Петкевич
Грибкова 2376295

belapan.com

# Апублікаваны службовыя дакументы

**У распараджэнне журналістаў трапілі копіі дакументаў, што пацвярджаюць наступленне смерці хворых на свіны грып у Мінску. Медычныя ўлады адмаўляюць такія выпадкі.**

У рукі журналістаў інтэрнэт-газеты naviny.by трапіла медычнае данясенне пра тое, што прычынай смерці двух чалавек стала пнеўманія. Аднак ва ўзорах тканкі памерлых «выяўлена РНК грыпу A(H1N1) swine». Як заявіла выданню аўтарытэтная крыніца, каля дзесяці чалавек памерлі ў Мінску ад пнеўманіі, якая стала ўскладненнем грыпу A(H1N1). Ананімная крыніца падкрэсліла: беларускім медыкам забаронена даваць інфармацыю грамадскасці.

Гісторыя смерці мужчыны 27-мі гадоў такая. Першапачаткова ён з высокай тэмпературай звярнуўся ў раённую паліклініку, лячыўся дома, але праз некалькі дзён апынуўся ў 6-й лякарні, дзе і памёр 26 кастрычніка.

Увогуле, паводле словаў крыніцы інтэрнэт-газеты naviny.by — доктара аднаго са шпіталёў Мінска — у Беларусі ад грыпу A(H1N1) паміраюць галоўным чынам маладыя людзі.

Складанасць у тым, што заключэнне пра смерць з'яўляецца толькі першым крокам у доказе смерці ад вірусу і, як падкрэсліў суразмоўца, дае магчымасць чыноўнікам бяздзейнічаць, заяўляць пра змяшаную інфекцыю і гэтак далей.

Для сцвярджэння, што смерць наступіла менавіта ад грыпу A(H1N1), патрэбны паталагаанатамічны дыягназ, гісталагічныя даследаванні, якія і здольныя даказаць, што прырода пнеўманіі звязана з вірусам A(H1N1). Медыцынскія чыноўнікі могуць сцвярджаць, што грып з'яўляецца фонавым дыягназам, а не першапрычынай ускладненняў, і будуць фармальна мець рацыю.

Пакуль доктар валодае інфармацыяй прыкладна пра дзесяць вірусалагічна пацверджаных выпадках смерці ў выніку грыпу A(H1N1). Ён сцвярджае: «Пнеўманія, пра якую ідзе гаворка, з'яўляецца ўскладненнем грыпу A(H1N1), не бактэрыяльнай, а звязанай з паражэннем сасудаў».

**naviny.by**

## Вірусныя інфекцыі: 7 практычных парадаў, як засцерагацца

**1.** Ёсць магчымасць зрабіць прышчэпку — рабіце, але толькі калі вы здаровыя, а, па-другое, калі для вакцынацыі не трэба будзе сядзець у смаркатым натоўпе ў паліклініцы.

**2.** Ніякіх лекаў з даказанай прафілактычнай эфектыўнасцю не існуе. Г.зн. ніякая цыбуля, часнок, гарэлка і таблеткі не здольныя абараніць ні ад якога рэспіраторнага віруса.

**3.** Крыніца віруса — чалавек і толькі чалавек. Чым меней людзей, тым менш шанцаў захварэць. Каранцін — выдатна! Забарона на масавыя зборні — выдатна! Прайсціся прыпынак пешшу, не пайсці лішні раз у супермаркет — мудра!

**4.** Маска. Карысная штука, але не панацэя. Абавязкова павінна быць на хворым, калі побач здаровыя: вірус яна не затрымае, але спыніць кропелькі сліні, асабліва багатыя вірусам.

**5.** Рукі хворага — крыніца віруса не менш значная, чым рот і нос. Хворы кранаецца твару, вірус трапляе на рукі, хворы хапае ўсё вакол, вы кранаецеся гэтага ўсяго рукой — добры дзень, вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі.

**6.** Паветра! Вірусныя часціцы гадзінамі захоўваюць актыўнасць у сухім цёплым і нерухомым паветры, але амаль імгненна разбураюцца ў паветры прахалодным, вільготным і рухомым. Гуляць можна колькі заўгодна. Падчапіць вірус падчас прагулкі нерэальна.

**7.** Стан слізістых абалонак! У верхніх дыхальных шляхах пастаянна ўтвараецца слізь. Слізь забяспечвае функцыянаванне т.зв. мясцовага імунітэту — абароны слізістых абалонак. Калі слізістая абалонка перасыхае, вірусы лёгка пераадольваюць бар’ер аслабленага мясцовага імунітэту, і чалавек хварэе з большай ступенню верагоднасці. Галоўны вораг мясцовага імунітэту — сухое паветра і лекі, здольныя высушваць слізістую абалонку.

**Рэцэпт ад сухасці:** 1 чайная лыжка солі на 1 літр гатаванай вады. Залівайце ў любы флакон-пшыкалку і рэгулярна пшыкаеце ў нос. Можна купіць фізіялагічны раствор ці гатовыя солевыя растворы — салін, аква марыс, хумер, марымер, насоль і г.д.

## Вірусныя інфекцыі: 10 практычных парадаў, як лячыцца

Правілы лячэння.

**1.** Цёпла апрануцца, але ў пакоі халаднавата і вільготна. Тэмпература каля 20°C, вільготнасць 50—70%. Мыць падлогу, праветрываць.

**2.** Катэгарычна не прымушаць есці. Калі хочацца — лёгкае, вугляводнае, вадкае.

**3.** Піць. Тэмпература вадкасці роўная тэмпературы цела. Кампоты, морсы, гарбату (у гарбату дробна парэзаць яблык), адвары разынак, курагі. Ідэальна для піцця — гатовыя растворы для пераральнай рэгідратацыі. Прадаюцца ў аптэках: рэгідрон, хумана электраліт, гастраліт.

**4.** У нос — часта солевыя растворы.

**5.** Банкі, гарчычнікі, прыпаркі — сродкі з разраду псіхатэрапіі.

**6.** Калі надумалі змагацца з высокай тэмпературай — толькі парацэтамол або ібупрафен. Катэгарычна нельга аспірын.

**7.** Пры паражэнні верхніх дыхальных шляхоў (нос, горла, гартань) ніякія адхарквальныя сродкі не патрэбныя — яны ўзмоцняць кашаль.

**8.** Супрацьалергічныя сродкі не маюць да лячэння ВРВІ дачынення.

**9.** Усе інтэрфероны для мясцовага прымянення — лекі з недаведзенай эфектыўнасцю або «лекі» з даказанай неэфектыўнасцю.

**10.** Гамеапатыя — гэта не лячэнне травамі, а лячэнне зараджанай вадой. Бяспечна.

## Калі абавязкова патрэбны доктар

- адсутнасць паляпшэнняў на чацвёрты дзень хваробы;
- павышаная тэмпература цела на сёмы дзень хваробы;
- пагаршэнне пасля паляпшэння;
- выражаны цяжар стану пры ўмераных сімптомах ВРВІ;
- з’яўленне ізалявана або ў спалучэнні: бледнасці скуры, смагі, адышкі, інтэнсіўнага болю, гнойных выдзяленняў;
- узмацненне кашлю, зніжэнне яго прадукцыйнасці; глыбокі ўдых прыводзіць да прыступу кашлю;
- пры павышэнні тэмпературы цела не дапамагаюць парацэтамол і ібупрафен;
- страта прытомнасці;
- сутаргі;
- цяжкасці дыхання, адышка, адчуванне недахопу паветра;
- інтэнсіўны боль дзе заўгодна;
- нават умераны боль у горле пры адсутнасці насмарку;
- нават умераны галаўны боль у спалучэнні з ванітаваннем;
- ацёчнасць шыі;
- высыпка, якая не знікае пры націсканні на яе;
- тэмпература цела вышэйшая за 39°C, якая не пачынае зніжацца праз 30 хвілін пасля прымянення гарачкапаніжальных сродкаў;
- любое павышэнне тэмпературы цела ў спалучэнні з дрыжыкамі і бледнасцю скуры.

**Д-р Яўген Камароўскі**

## Адзіны прэпарат, здольны разбурыць вірус свінога грыпу

гэта азелтамівір, камерцыйнае імя — таміфлю. Таміфлю рэальна разбурае вірус, блакуючы бялок нейрамінідазу (тую самую N ў назве H1N1).

Таміфлю не ядуць усе пагалоўна пры любым чыху. Яго выкарыстоўваюць тады, калі хвароба працякае цяжка або калі нават лёгка хварэе чалавек з групы рызыкі — старыя, астматыкі, дыябетыкі. Сутнасць: калі паказана Таміфлю, то паказана, як мінімум, назіранне доктара і, як правіла, — шпіталізацыя.

Грып — лёгкая хвароба для большасці. Лячэнне вострых рэспіраторных вірусных інфекцый наогул і грыпу ў прыватнасці — гэта не глынанне таблетак! Гэта стварэнне такіх умоваў, каб арганізм лёгка з вірусам справіўся.

**ВЖ**




# Ад грыпу памагае нават сэкс

Разам з панікай і эпідэміяй грыпу распаўсюджваюцца і міфы пра грып. Перад тым як бегчы ў аптэку па немавед што немавед ад якой хваробы карэспандэнты «Нашай Нівы» даведаліся ў доктара **Змітра Салошкіна**, з чым ядуць гэты свіны грып і чым ад яго ратавацца.

**«Наша Ніва»: Што такога страшнага ў свіным грыпе?**

**Зміцер Салошкін:** Грып з вірусных хваробаў выклікае найбольш увагі, бо ён вельмі зменлівы. Да яго немагчыма прыстасавацца і выпрацаваць сталы імунітэт. Раз на пэўную колькасць гадоў ён кардынальна мяняецца. З гэтым звязаныя эпідэміі, якія ахопліваюць цэлыя кантыненты. Свіны грып небяспечны тым, што гэта зусім новы від віруса.

Не варта пераносіць цяжкія праявы грыпу на нагах.

**«НН»: Чым увогуле грып розніцца ад іншых прастудаў?**

**ЗС:** Ён мае больш цяжкае цячэнне і праявы. Тэмпература збіваецца горш і на меншы тэрмін. Ярка выражаныя праявы інтаксікацыі. Калі гэта грып, то чалавек будзе некалькі дзён ляжаць, збіваць тэмпературу на 30 хвілінаў ці пару гадзінаў. Яму не будзе хацецца ні есці, ні піць, ні задавальненняў — нічога. Плюс яшчэ грып хутка перадаецца.

**«НН»: Сёння ў людзей ідзе стойкая асацыяцыя: свіны грып, эпідэмія, усе памруць…**

**ЗС:** Паніка ідзе ад таго, што гэта новае захворванне. Не трэба думаць, што ад свінога грыпу людзі будуць паміраць, як ад халеры, напрыклад. Хутка ў людзей выпрацуецца імунітэт, і A/H1N1 адступіць.

**«НН»: Ці вялікая рызыка памерці ад свінога грыпу?**

**ЗС:** Паміраюць не наўпрост ад грыпу, а ад яго ўскладненняў. Напрыклад, пнеўманіі. Дзеці, старыя ці людзі з паніжаным імунітэтам у небяспецы пры любой віруснай эпідэміі. Падчас звычайнага грыпу ў часткі хворых бываюць цяжкія праявы, сардэчная недастатковасць ці паражэнне лёгкіх.

**«НН»: Але насамрэч прычына смерці можа хавацца ў грыпе?**

**ЗС:** Заўсёды можна сказаць, што чалавек памёр не ад свінога грыпу, а ад пнеўманіі. Калі ісці далей у гэтай гульні словаў, усе людзі на свеце паміраюць ад сардэчнай недастатковасці. На што б яны ні хварэлі, урэшце спыняецца сэрца і чалавек лічыцца нежывым.

Чалавек захворвае на грып, які выклікае запаленне ў арганізме. Лёгкія — адзін з першых органаў, што трапляецца на шляху інфекцыі. Адбываецца запаленне, якое можна інтэрпрэтаваць як пнеўманію. Далей можа быць прыгнятанне імунітэту, развіваецца татальная рэакцыя ў лёгкіх, што выклікае парушэнне дыхання, сардэчнай дзейнасці і смерць чалавека. Далей ідзе гульня. Калі патрэбна па статыстыцы, каб гэта было не ад грыпу, то будзе запісана: вірусная пнеўманія. Калі не патрэбна — запішуць: ускладненні ад грыпу.

Галоўнае, каб не выйшла так, што ўсіх будуць залічваць як хворых на грып, нават людзей з інфарктамі і болямі ў грудзях. Нагнятанне істэрыі небяспечнае, бо ўсе пачынаюць думаць толькі пра грып і забываюцца на іншыя хваробы.

**«НН»: Калі гэта ўсё ж такі грып. Чым лячыцца?**

**ЗС:** Гарантаванага прэпарату няма. Збольшага гэта дапаможныя прэпараты, розныя чалавечыя інтэрфероны, якія закапваюць у нос і падвышаюць імунны бар’ер. Не варта пераносіць цяжкія праявы грыпу на нагах. Не трэба баяцца, што без цябе заваліцца праца фірмы ці ўстановы.

**«НН»: А як жа часнок, цыбуля, гарбата?**

**ЗС:** Чалавек, які верыць у часнок ці алей чайнага дрэва, адчувае сябе абароненым. У яго лепшы настрой, выпрацоўваюцца эндарфіны, якія стымулююць арганізм і трымаюць у тонусе. Выпрацоўваюцца стандартныя ахоўныя рэчывы (інтэрфероны, імунаглабуліны) і ўскосна сапраўды ён больш абаронены ад вірусаў.

Маску выкарыстоўвайце толькі ў транспарце ці на рызыкоўнай працы і мяняйце яе кожныя 2—3 гадзіны.

Такім чынам, можна і сэкс параіць людзям. Гэта таксама вялікі выкід эндарфінаў, якія будуць мець супрацьвіруснае дзеянне. Псіхіка чалавека — нашмат мацнейшы інструмент, чым гэтыя лекі.

**«НН»: Дык варта проста заставацца ў пазітыўным настроі? І не абавязкова насіць павязкі?**

**ЗС:** Павязкі — гэта штучны бар’ер, які дапамагае, калі ты ездзіш у метро ці ў аўтобусе. Прычым маску трэба мяняць кожныя 2-3 гадзіны. Але калі чалавек будзе ў стрэсе, павязка яго не ўратуе. Бо на гэты стрэс арганізм будзе выкарыстоўваць унутраныя сілы, якія маглі б пайсці на будаўніцтва інтэрферонаў і процістаянне інфекцыям.

**Настасся Шамрэй**

**Інтэрфероны**

гэта пэўныя бялкі з падобнымі ўласцівасцямі, якія выдзяляе арганізм у адказ на з’яўленне віруса. Чалавечыя інтэрфероны прадаюцца ў ампулах. Іх трэба разбаўляць і закапваць у нос. Пакуль інтэрфероны жывыя, яны бароняць ад вірусаў.

# Сустрэча палітычных выгнанцаў

**27 кастрычніка Зянон Пазняк сустрэўся са студэнтамі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.**



Юлія Дарашкевіч

Без адукацыі для нацыі вы будзеце нішто.

Ужо ў цягніку з Мінска да Вільні, а пасля ў тралейбусе да вуліцы Валакупю, дзе знаходзіцца ЕГУ, можна было пачуць: маўляў, «сёння пабачым жывога Пазняка».

Лекцыйная зала, у якой праходзіла сустрэча, была набітая пад завязку: студэнтамі, выкладчыкамі і тымі, хто проста прыехаў паглядзець на Зянона. Маладыя людзі загіпнатызавана глядзелі на пазнякоўскі кулак, які перыядычна лятаў у паветры пры закліках байкатаваць выбары.

Здавалася, вярнуліся старыя часы, калі Зянон збіраў тысячныя натоўпы. Здавалася так, ажно пакуль студэнты не пачалі задаваць пытанні. Яны — маладыя і цынічныя — не збіраліся прымаць ягоную пазіцыю. Пасля працяглага выказвання наконт таго, што просты чалавек можа змагацца з рэжымам, размаўляючы па-беларуску, падняўся студэнт. Выбачыўшыся за тое, што не дапамагае бацькаўшчыне і не размаўляе па-беларуску (гэта прагучала даволі з'едліва), ён запытаўся пра Курапаты: «Экспрэсіўная афарбоўка вашых метафар пра Курапаты, якая была раней, такой яна і засталася. Скажыце, калі ласка, гэта значыць, што Вы не ўмееце прызнаваць свае памылкі?»

Пасля агучкі пытання моладзь актыўна запляскала ў далоні. Сутыкненне розных пакаленняў адбылося. Магія знікла. Не варта казаць, што адказ расцягнуўся не на адну хвіліну.

Было зададзена і сакраментальнае пытанне пра вяртанне самога Зянона. На гэта ён распавёў пра ранейшыя спробы вяртання, пра пагоні і ўцёкі, пра тое, што існуе загад страляць на паражэнне пры ягоным супраціве. «Усё ж такі жывы палітык можа значна больш зрабіць, чым у выглядзе трупа. Хоць мяне і называюць палітычным трупам, але лепш быць палітычным трупам, чым рэальным».

Улічваючы ранейшае стаўленне Пазняка да ЕГУ, многія не верылі, што ён пагодзіцца прыехаць і выступіць перад студэнтамі. Дырэктар дэпартамента «Гісторыя» Павел Церашковіч запытаўся пра тое, ці змяніў Зянон, заўсёды скептычны да студэнтаў ЕГУ, сваё стаўленне да ўніверсітэта? Пазняк адказаў дыпламатычна: маўляў, за моладдзю будучыня і ён бачыць у ЕГУ перспектыву. «Я ніколі не быў катэгарычным у палітыцы да моладзі», — адзначыў Пазняк.

Абмеркаванне сучаснай беларускай палітыкі паміж студэнтамі ЕГУ і Пазняком цяжка назваць важным ці вельмі сэнсоўным. Большасць тых, што прыйшлі на сустрэчу, хацела проста «сфоткацца з самім Зянонам» або атрымаць аўтограф, каб пасля распавядаць сябрам і знаёмым, а то і будучым дзецям, што яны бачылі яго, «таго самага Пазняка». Для *маладых і цынічных* і тое нямала.

## Апора на народ

**— Уявіце сітуацыю, калі Лукашэнка сыдзе з улады. Ці будзе такі чалавек, які зможа ўзяць уладу і павесці за сабой народ? Асабіста я такога прэтэндэнта не бачу.**

— Не трэба ніякіх прэтэндэнтаў (*у зале смех і апладысменты*). Хопіць аднаго Лукашэнкі. Трэба забяспечыць дэмакратычныя выбары і паверыць у свой народ, выбраць дэмакратычны парламент і адразу перайсці на Канстытуцыю 1994 года. Трэба выбраць прэзідэнта, які быў бы абмежаваны канстытуцыяй, і тады ўжо правесці рэформу заканадаўчай улады. Асноўны накірунак — на парламенцкую рэспубліку. Народны Фронт на гэта і разлічваў. Дык вось, калі скончыцца Лукашэнка, трэба, каб адышоў увесь гэты рэжым, які ён пабудаваў. І пачынаць трэба з народнай улады, з дэмакратычных выбараў, з парламента, з нармальнага заканадаўства. Тэзіс — апора на народ. Вельмі кемлівы, талковы народ, але яго загналі ў такую сітуацыю.

## Курапаты

**— Вы гаварылі пра Курапаты і сказалі, што там расстрэльвалі цэлы народ, 20 гадоў таму Вы казалі пра 250 тысяч, цяпер гісторыкі і палітыкі кажуць пра 7,5 тысяч чалавек. Экспрэсіўная афарбоўка Вашых метафар пра Курапаты, якая была раней, такой яны і засталася. Скажыце, калі ласка, гэта значыць, што Вы не ўмееце прызнаваць свае памылкі?** (*Апладысменты ў зале.*)

— Калі б гэта былі памылкі, то яны былі б адразу прызнаныя. Курапаты — гэта тая сітуацыя, якая выявіла злачынства камуністычнай сістэмы. Калі злачынства зробленае, то галоўны доказ — знайсці труп. Курапаты адкрылі трупы тых людзей, якія былі знішчаныя. Эксгумацыя вялася археалагічнымі метадамі, і яе рабілі прафесійныя археолагі, таму даказана, што прыблізна ў канцы 1940-х гадоў былі зробленыя раскопкі ўсіх магіл, і гэта даказана дакументальна і даследавана. Улічыўшы верхні пласт расстраляных і падлічыўшы пласты і колькасць трупаў, якія былі ў кожнай магіле і маглі там быць, мы выходзім на лічбу ў 250 тысяч расстраляных. Усё астатняе, што адбывалася пасля — барацьба. Асабліва з рэстаўрацыяй гэтай улады нашчадкі тых, хто расстрэльваў, спрабавалі даказаць, што нічога падобнага не было.

## Жыццё ламае планы

**— Вы збіраецеся ажыццявіць байкот прэзідэнцкіх выбараў і спалучыць гэта з агітацыяй людзей на плошчу?**

— У грамадстве многія людзі настроеныя не ісці галасаваць. Мінулыя выбары паказалі, што ў грамадстве гэта можа рэалізавацца. Я магу сказаць пэўную канцэпцыю, якую мы выстраілі, але жыццё дае часам такія сітуацыі, што трэба адмаўляцца ад аднаго і рабіць іншае. Яшчэ больш за год да выбараў, і цяперашняя задача перад намі — тлумачэнне нашай пазіцыі, распаўсюджанне літаратуры, сустрэчы з людзьмі, асветніцкая дзейнасць і г.д. Без ажыццяўлення гэтага будзе цяжка перайсці да новага этапу.

## Лепш быць палітычным трупам, чым рэальным

**— Якія ўмовы неабходныя, каб Вы вярнуліся ў Беларусь?**

— Я ўжо адзін раз вяртаўся. Пасля таго як я выехаў за мяжу, атрымаўшы абсалютна дакладныя звесткі, што на тым эскадроне, які стварылі, я павінен быць першым. Я прыехаў, быў на мітынгу, выступіў там і ўдалося нават прыехаць у сядзібу Фронта, хаця ўжо быў эскорт з АМАПа. Лукашэнка сабраў тады старшынь КДБ, МУС і даў разнос, што, маўляў, яны ўпусцілі Пазняка. Дык, можа, вы мне прапануеце трэці раз прыехаць? (*Смех і апладысменты.*) Я ведаю дакладна, што ёсць загад пры спробе супраціву ці ўцёкаў страляць на паражэнне. Ну і што? Усё ж такі жывы палітык значна больш можа зрабіць, чым у выглядзе трупа. Хоць мяне і называюць палітычным трупам, але лепш быць палітычным трупам, чым рэальным. (*Апладысменты.*)

## Трэба арганізаваная група

**— Вы казалі, што ўжо 15 гадоў уладу ў Беларусі трымае неадукаваны чалавек. Ці не лічыце Вы, што гэта заканамерна? Як, на Вашу думку, можна змяніць сітуацыю?**

— Гэтая пасіўнасць відавочная. Але гэта не сутнасць, а вынік гэтага рэжыму. І не толькі гэтага — 70 гадоў савецкага рэжыму. Людзей застрашылі, напалохалі. Задача — гэты страх перамагчы. І методыка такая: каб узрушыць грамадства, трэба стварыць такую арганізаваную групу, дзе людзі не будуць баяцца.

## У глабальны свет асобным вагонам

**— Чаму Вы лічыце, што менавіта ідэямі свабоды і дэмакратыі можна працягнуць шлях нацыятварэння?**

— Каб прыйсці да глабальнай інтэграцыі, трэба прайсці нацыянальны шлях. Уся Еўропа прайшла гэты шлях і стварыла моцныя нацыянальныя культуры. І для іх гэтая праблема не існуе. На сёння галоўным прынцыпам суверэнітэту ў свеце робіцца нацыянальная культура, захаванне сваёй ідэнтычнасці праз культуру. І дзе б такі чалавек ні быў, яму глабалізацыя не страшная, а нам — страшная. Нацыя на пачатку XX ст. паспела ў апошні вагон, але справа была затармажана. Калі мы яе не скончым, не ўладкуем нашу гістарычную нацыянальную свядомасць, нашу культуру, заснаваную на нашай гісторыі, на нашай мове, мы ні ў які глабальны свет асобным вагонам не палезем.

## Адукацыя важнейшая за палітыку

**— Зянон Станіслававіч, Ваша стаўленне да нашай інстытуцыі было раней не самым пазітыўным. Цяпер Вашае стаўленне змянілася?**

— Нельга знішчаць моладзь па палітычных ідэях. Я хачу вам пажадаць аднаго — каб вы скончылі ўніверсітэт і атрымалі адукацыю. Тады вы будзеце апорай нашай нацыі. Калі вы не будзеце мець гэтай адукацыі, павіснеце ў паветры, загубіце сваю адукацыю для нейкіх эфемерных ідэй ці нават дзеля палітыкі кінеце ўсё і страціце — у палітыцы вы нічога не зробіце ў 20 гадоў, а адукацыю страціце і потым для нацыі вы будзеце нішто.

**Вольга Жарнасек**

# Дзяды ў Курапатах

**Сёлетнія Дзяды ў Мінску прайшлі, як і штогод, годна і стрымана. Міліцыя была падкрэслена карэктнай.**

Як і належыць на жалобным мерапрыемстве.

Арганізатары шэсця ў Курапаты, сябры Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ, падрыхтавалі акцыю грунтоўна.

Падрыхтаваліся да Дзядоў і ўлады. Нехта заўважыць, што яны рыхтуюцца да акцыі штогод, але сёлета было чаму здзівіцца.


PHOTO.BYMEDIA.NET

У Курапаты прыходзяць не толькі відавочцы сталінізму, але і моладзь.

### А ты чытаў Якубовіча?

Артпадрыхтоўкай стаў артыкул у лукашэнкаўскай газеце «Советская Белоруссия», прысвечаны Курапатам. Артыкул выйшаў напярэдадні Дзядоў, аўтар — галоўны рэдактар выдання Павел Якубовіч. Акрамя таго, у тым жа нумары былі надрукаваныя матэрыялы адмысловага круглага стала на тэму Курапатаў, у якім прынялі ўдзел гісторыкі, палітыкі і святары, у тым ліку і навуковы кіраўнік мемарыяльнай зоны «Курапаты» Мая Кляшторная, а таксама сп. Якубовіч. Ён заклікаў «скончыць са «шматгадовым змрочным спектаклем» адмаўлення праўды», чым відавочна азадачыў многіх.

Чацвярговы нумар «СБ» жыва абмяркоўвалі ўдзельнікі шэсця. «А ты чытаў Якубовіча пра Курапаты, што ён там панапісваў?» — «Ат, нічога талковага! І з чаго ўсе такі шум усчалі?» — «Якубовіч дапісаўся да таго, што гэта ён Курапаты адкрыў!»

### Могуць, калі захочуць

Міліцыянты і ДАІшнікі былі падкрэслена карэктнымі, загадзя перакрывалі вуліцу на шляху шэсця. Праўда, адзін з міліцыянтаў у цывільным папрасіў паўжартам аднаго з арганізатараў, Алеся Чахольскага, рухацца трохі хутчэй. Змерзлі, маўляў, «органы». Міліцыя падрыхтавала маршрут да канца: на адрэзку дарогі ўздоўж кальцавой да падземнага пераходу ва ўрочышча да самага падыходу дэманстрантаў была забароненая стаянка транспарту. Могуць жа, калі захочуць! Ці загадаюць.


СЯМЁН ПЕЧАНКО



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ


СЯМЁН ПЕЧАНКО

### «Смотри, какие красивые знамёна»

Чым бліжэйшымі былі Курапаты, тым больш абазнаныя трапляліся грамадзяне: «А, дык гэта ж сёння Дзяды, у Курапаты людцы ідуць». З дарогі рэгулярна даносіліся прывітальныя сігналы аўто. Некаторыя аўтааматары прыпыняліся, каб лепей разгледзець шэсце. «Смотри, какие красивые знамёна», — сталага веку мужчына на прыступках крамы ўзняў над галавой унука.

### Дзякуй моладзі

На жалобным мітынгу сярод курапацкіх крыжоў ды соснаў з вуснаў арганізатараў прагучала падзяка моладзі — заўтрашняму дню Беларусі. А моладзі было і сапраўды шмат. Моладзь памятае.

**Сямён Печанко**

КАМЕНТАР

# Курапаты ці лінія Сталіна?

Працяг са старонкі 2.

Газета ўсчынае дыскусію аб падзеях 70-гадовай даўніны, хоць сёння, куды ні плюнь, куча праблем. У святле эканамічнай сітуацыі пад пытаннем увогуле існаванне Беларусі».

Што выклікала гнеўную рэакцыю чытача? Падчас круглага стала ў «СБ» яго ўдзельніца Мая Кляшторная згадала добрым словам літаратуразнаўцу Рыгора Бярозкіна. Можна было б распавесці «палкоўніку Абакумаву», што Бярозкін быў арыштаваны НКВД у красавіку 1941 года як «беларускі буржуазны нацыяналіст» і цудам пазбег смерці. (Калі энкавэдэшнікі пачалі яго расстрэльваць, ён упаў і прыкінуўся мёртвым. Гэта адбывалася 26 чэрвеня, немцы былі зусім побач, і расстрэльная каманда пабаялася затрымлівацца, каб праўдзіць, ці выканалі яны сваю справу.) Бярозкін ваяваў потым чатыры гады, пад Масквой і пад Сталінградам, дайшоў да Берліна, але ў 1949-м быў адпраўлены ў лагер пасля даносу аднаго з калег-пісьменнікаў.

Але падобных палкоўнікаў ні ў чым не пераканаеш.

Чаго варты псеўданім, які выбраў аўтар каментара! Начальнік «Смерш», пасля вайны — міністр дзяржбяспекі СССР Віктар Абакумаў праславіўся яшчэ ў канцы 1930-х гадоў на працы ў НКВД тым, што асабіста збіваў арыштаваных на допытах. Пакуль яго самога не пасадзілі ў 1951-м. З турмы ён болей не выйшаў.

### Сталін ні пры чым?

Цікава і тое, што ні ў рэдактарскім артыкуле, ні ў выказваннях за «круглым сталом» не згадваецца імя Сталіна.

Згадваюцца Кабулаў, Мяркулаў, Наседкін, Панамарэнка, Варашылаў, Кагановіч, Хрушчоў, ХХ з'езд, які развянчаў сталінскі культ, а сам Сталін — не! Напэўна, каб, гаворачы пра Курапаты, не зачапіць выпадкова «Лінію Сталіна». Не згадваецца, дарэчы, і НКВД — толькі ў адным месцы гаворыцца пра «чэкістаў», якія таксама былі ахвярамі рэпрэсій. Але ці магчыма весці гаворку пра помнік, які можа аб'яднаць беларусаў, і абмінуць тэму сталінскіх злачынстваў?

### Крот гісторыі

Аўтар рэдакцыйнага артыкула ў «СБ» заклікае не раздзіраць да бясконцасці «старыя раны» і не шукаць «вінаватых, якіх даўно няма на свеце». На яго думку, трэба абвясціць Курапаты могілкамі агульнацыянальнага маштабу («хай далучаюцца БРСМ, «Белая Русь» і «Малады фронт», незарэгістраваны таксама — хопіць ярасці, усе — беларусы!»), устанавіць там стэлу з надпісам «тут пахаваны людзі» і на гэтым паставіць кропку.

### Мая Кляшторная пярэчыць

«Падзеі, што пакінулі нам магілы «Курапаты», адбываліся на дзяржаўным узроўні, — кажа яна. — Дзяржава павінна раскрыць гістарычную праўду гэтых канкрэтных падзей, прынесці прабачэнне і стварыць помнік трагічнаму часу і палеглым у курапацкім лесе».

Гістарычная праўда пра лёс канкрэтных людзей — гэта нешта зусім іншае, чым надпіс «тут пахаваны людзі».

«...На могілках не прынята шпацыраваць калонамі, спяваць песні і падвышаць голас», — піша Павел Якубовіч. Цяжка з гэтым не пагадзіцца. Але разганяць і затрымліваць — гэта хіба па-людску? Ці гэтага не было ў нядаўнім мінулым, калі «юныя, гарачыя валанцёры клаліся пад колы абыякавых грэйдэраў»? А можа, такога больш няма сёння?

У дзень выхаду газеты «СБ. Беларусь сегодня» у Мінску міліцыя затрымлівала юнакоў, якія вывесілі бел-чырвона-белыя сцягі на праспекце Незалежнасці, а таксама журналістаў, якія рабілі фотаздымкі.

Крот гісторыі спраўна робіць сваю працу. Магчыма, аднойчы газета зладзіць круглы стол, удзельнікі якога будуць захоплена казаць і пра тых маладых актывістаў.

**Віталь Тарас**

# Пошасці «залатога веку»

Жыхары Мінска XVII ст. пакутавалі ад уздзеяння рэчыва, з якога ў XX ст. было сінтэзавана ЛСД. Піша **Алег Дзярновіч**.

Часта мінулыя стагоддзі ўяўляюцца нам залатымі часамі, маральна і фізічна здаравейшымі за тлумную цяперашчыну. Але даследаванне тэмы масавых захворванняў у Беларусі XIV—XVII стст. прымушае больш крытычна азірнуцца на іх.

### Чума па-за канкурэнцыяй

У гэтым пытанні Беларусь заўжды была часткаю сусветнай супольнасці, яе закранalі сваім чорным крылом усе агульнаеўрапейскія пошасці. Найбольшую вядомасць атрымалі эпідэміі чумы. Маштабы пандэміі набыла чума 1346—1351 гг., якая прыйшла з Усходняга Кітая і ад якой у Еўропе загінула 34 мільёны чалавек. «Чорнай смерці» сярэдзіны XIV ст. прысвечана вялікая колькасць літаратуры. У Маскве, калі чума ў 1353 г. дасягнула гэтага горада, ад эпідэміі памёр і сам вялікі князь Сімяон Горды.

Наколькі моцна пошасць зачапіла тагачасную Беларусь? Маем толькі асобныя згадкі — як пра Полацк у 1349 г., калі «мор быў на людзей». Мо адыграла ролю меншая ўрбанізацыя нашага краю ў параўнанні з Заходняй Еўропай. Смяротныя бактэрыі не ў стане прадрацца праз пушчы і балоты, ідэальным асяроддзем для іх былі гарады з высокай канцэнтрацыяй людзей і антысанітарыяй.

### Адзіныя лекі — замкнёная брама

У XIV—XVII стст. практычна не было шанцаў вылечыць тых, хто захварэў. Адзінае, што можна было зрабіць — не даць хваробам пашырацца. Так і дзейнічала тагачасная адміністрацыя.

Невядома, ці рабіў што вялікі князь Альгерд, каб спыніць тую пошасць XIV ст. у сваёй дзяржаве. А вось яго ўнук, кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары, у 1536 г. выдаў інструкцыю для жыхароў Вільні, якая стала ўзорам і для іншых гарадоў Вялікага Княства. Найперш, з прыходам пошасці ў мясцовасць гараджанам прапаноўвалася складаць тэстаменты. Каб у выпадку смерці ад хваробы сярод нашчадкаў не было маёмасных спрэчак. Уладам места прадпісвалася зачыніць усе брамы, апроч адной. А ля той выставіць варту, якая б не ўпускала ў горад людзей з заражанай мясцовасці. Лекары мусілі інфармаваць бурмістраў пра любыя новыя выпадкі захворванняў.

Менавіта пасля гэтага акта Жыгімонта ў Вільню была праведзеная вада па трубах, а пры кляштарах і шпіталях заснаваныя грамадскія лазні. У 1571 г. кароль і вялікі князь Жыгімонт Аўгуст заснаваў адмысловае ведамства, якое павінна было займацца «змяншэннем наступстваў мору» — contubernium.

Самаізаляцыя ў тых умовах была адным з найбольш эфектыўных сродкаў ад пашырэння эпідэміі. Здароўе суайчыннікаў стаяла вышэй нават за эканамічныя інтарэсы. Калі ў другой палове XV ст. гарадскія ўлады Полацка атрымлівалі звесткі пра пачатак эпідэміі у Рызе, яны выстаўлялі кардоны і спынялі так выгадны гандаль з гэтым ганзейскім горадам — «бо гэта ёсць ва ўсіх землях такі звычай».

### Бабуля свінога грыпу

Між тым, пісьмовыя крыніцы фіксуюць цэлы шэраг хваробаў, вызначэнне якіх выклікае цяжкасці. У 1530 г., паводле сведчанняў сучаснікаў, «заражаныя былі морам у летнія месяцы многія гарады і вёскі». Гэта была эпідэмія «англійскай потавай гарачкі», якая суправаджалася павышанай тэмпературай, галаўнымі болямі, санлівасцю і, што стала вельмі адметным, — рэзкай патлівасцю. Часта вынікам гэтай хваробы была смерць.

Эпідэміёлагі сцвярджаюць, што цяпер «англійская потавая гарачка» не фіксуецца. Гэта магла быць адна з формаў грыпу, сярод штамаў якога ўвесь час адбываюцца мутацыі. Адпаведна, і чалавецтва выпрацоўвае імунітэт да розных яго формаў. А ўсё ж хвароба вяртаецца — то ў птушыным, то ў свіным абліччы.

Яшчэ адну дзіўную хваробу апісаў у 1695 г. мінскі ваявода Крыштаф Завіша. У сваім «Дыярыюшы» ён занатаваў, як хвароба «курчыла людзей, ад чаго паміралі хутка, і ў якім доме пачыналася гэта, там усе паміралі». Найбольш гэтая бяда закранала сялян.

Свае назіранні пра падобнае пакінуў і яшчэ адзін жыхар Мінска канца XVII ст., ксёндз Бэргаф: «Бог дапусціў на гэтае ж ваяводства страшную і заразную хваробу, якая шмат ахвяраў забрала з класы бяднейшага люду. Гэта былі невыносныя сутаргі, якія калі каго-небудзь паражалі, той ад моцнага болю выгінаўся, а прыходзіў у сябе, збягаў у лясы як пазбаўлены розуму чалавек, а калі хто лавілі людзі, то выяўляў жахлівую пражэрлівасць і еў за дзесяцёх».

На думку гісторыка Валянціна Грыцкевіча, сімптомы характэрныя для паражэння цэнтральнай нервовай сістэмы, што бываюць, да прыкладу, пры энцэфаліце. Праўда, гісторык адзначае, што захворванне, выкліканае клешчавым энцэфалітам, стала выяўляцца ў жыхароў лясных раёнаў Беларусі толькі ў другой палове XX ст. Бо лічыцца, што гэтыя кляшчы былі занесеныя да нас пасля Другой сусветнай вайны.

Ёсць і яшчэ адна хвароба, сімптомы якой вельмі нагадваюць апісаныя. Гэта эргатызм — харчовы таксікоз, які ўзнікае ў выніку спажывання спарынні.

### Сялянскае бедства

Спарыння — гэта род грыбоў, які паразітуе на 170 культурных і дзікарослых злаках, часцей за ўсё на жыце і пшаніцы. Увесну грыбкі прарастаюць на глебе, утвараючы да 30 мясістых пурпуровых неафармленых целаў на доўгай ножцы з чырванаватымі галоўкамі.

Падступны грыб выдзяляе ліпкую саладкаватую вадкасць («мядзвяную расу»), якая прываблівае інсектаў. Насякомыя і распаўсюджваюць споры грыбка ды выклікаюць масавае заражэнне раслін. Урэшце, грыбок-паразіт пачынае засвойвацца ў злаку. У каласах замест зерняў утвараюцца буйныя ражкі спачатку фіялетавага, потым чорнага колеру. У гэтых ражках і ўтрымліваюцца алкалоіды (біялагічна актыўныя рэчывы на аснове азоту) спарынні, якія выклікаюць атручэнне людзей і жывёл.

У даўнія часы, калі кліматычныя ўмовы спрыялі развіццю спарынні, здараліся эпідэміі «Антоніевага агню». З зернем, праз муку, спарыння трапляла ў сялянскія хлеб ці кашы і выклікала сутаргі і працяглыя спазмы мускулатуры. Суседзі ці сваякі пацярпелых маглі таксама назіраць псіхічныя разлады, парушэнне функцый вачэй, якое пазней пераходзіла ў катаракту. Часта пасля пакутаў наступала смерць хворага. Менавіта такія сімптомы апісваў ваявода Завіша.



З дапамогай такіх масак дактары ў Сярэднявеччы засцерагаліся ад эпідэмій. Пад нос клалі духмяныя зёлкі для дэзінфекцыі паветра.

У Беларусі масавае развіццё спарынні назіралася на тарфяна-балотных глебах Палесся, на пасевах паблізу вадаёмаў і лясоў з павышанай вільготнасцю паветра. Толькі ў XVIII ст. медыцына здолела выразна дыягнаставаць прычыны выпадкаў крайняй псіхічнай нераўнавагі, агрэсіі і сутаргаў у земляробаў. Ужо медыкі былі здольныя падказваць уладам, што рабіць у такіх сітуацыях — займацца канкрэтнымі хворымі, правяраць пасевы, але не ўводзіць карантін у цэлых рэгіёнах.

Таксама пашырэнне ў XVIII ст. бульбы як асноўнай харчовай культуры сялянства зменшыла рызыкі ад спарынні. Сучаснае развіццё аграгэхнікі дазваляе практычна цалкам пазбавіцца ад спарынні — праз культуру земляробства, нават не ўжываючы хімікаліі.

Але гісторыя са спарынньёй атрымала нечаканы працяг у XX ст.

### ЛСД расце на жыце

У 1938 г. у Базелі швейцарскі хімік Альберт Гофман, праводзячы ў фармакалагічных мэтах эксперыменты са спарынньёй, сінтэзаваў рэчыва, названае ім LSD. Праз пяць гадоў, паўтараючы сінтэз амаль забытага прэпарату, Гофман адкрыў псіхадэлічны эфект LSD — навуковец выпадкова атрымаў ін'екцыю праз кончык уласнага пальца.

Напачатку LSD сапраўды выкарыстоўвалася ў гомеапатычных дозах як лекі супраць псіхічных разладаў, мігрэні і дэпрэсіі. Але ў бурлівыя 1960-я ў ЗША ён стаў сімвалам «моладзевай рэвалюцыі». Прадстаўнікі контркультур сталі актыўна выкарыстоўваць псіхадэлічны эфект LSD, які, у сваю чаргу, выклікаў стан псіхалагічнай залежнасці. Улады абвясцілі LSD вайну, забараніўшы прэпарат, у тым ліку і ў псіхіятрычнай практыцы. Сам Гофман называў LSD «лекамі для душы» і быў засмучаны тым, што вынайдзены ім прэпарат сышоў у андэграўнд. Вынаходнік прызнаваў, што LSD можа быць небяспечным у дрэнных руках. Сваю кнігу, напісаную ў 1979 г., Гофман так і назваў — «LSD: Маё праблемнае дзіця». Памёр вынаходнік зусім нядаўна, 29 красавіка 2008 г., на 102-м годзе жыцця.

Сёння LSD застаецца элементам клубнай культуры. Гэта адзін з найбольш моцных і небяспечных сродкаў, якія ўздзейнічаюць на падсвядомасць чалавека. Да таго ж LSD цяжка выявіць — у Мінск яго завозяць у выглядзе марак (паперак, прамочаных невялікай колькасцю рошчыны). Ёсць грымаса гісторыі ў тым, што пераможаны ў мінулым атрутны грыбок-паразіт вярнуўся ў выглядзе «рэчыва для асалоды». Тут пазайздросціш рацыянальнасці продкаў.

# Кастрычніцкая рэвалюцыя на самой справе была рэстаўрацыяй

Да такога вываду прыйшоў выдатны гісторык Расіі Рычард Пайпс.

У лютым панурага 1917-га шмат хто паверыў у дэмакратычную будучыню Расіі. Манарх адрокся, быў сфармаваны дэмакратычны ўрад. Але ішла вайна, а новы дэмакратычны лад больш нагадваў анархію. Уладзімір Ленін наважыўся на новую рэвалюцыю. Бальшавікоў падтрымалі левыя эсэры і анархісты. Слабасць Часовага Урада не дазволіла яму абараніць уладу.

### Гістарычная заканамернасць

На падзеі кастрычніка 1917-га ў сусветнай гістарыяграфіі існуюць розныя погляды. Самі бальшавікі спачатку называлі свой прыход да ўлады «Кастрычніцкім пераваротам». Сталін у 1918 годзе назваў артыкул, прымеркаваны да першай гадавіны тых падзей, «Аб кастрычніцкім перавароце». Аднак пазней тэрмін «пераварот» быў прызнаны негатыўным. І заменены спачатку на «рэвалюцыю», а потым і ўвогуле на «Вялікую кастрычніцкую рэвалюцыю». «Пераварот» вярнуўся ва ўжытак толькі ў канцы 1980-х.

Рычард Пайпс — амерыканскі даследчык расійскай рэвалюцыі і гісторыі Расіі XX ст. — увогуле разглядае ўсталяванне камуністычнай улады на тэрыторыі былой Расійскай Імперыі як гістарычную заканамернасць.

### Вытокі камунізму — у царызме

Пайпс сцвярджае, што лютаўская рэвалюцыя была часовай памылкай у шэрагу падзей 1917 года. Расійскае грамадства проста не было гатовае прыняць капіталістычны лад, не было гатовае і да прыватнай уласнасці. Пайпс прыходзіць да высновы, што вытокі расійскай формы камунізму можна прасачыць у далёкім мінулым: у сярэднявечнай Маскові адзіным рэальным уласнікам быў вялікі князь (цар). Ён мог распараджацца не толькі казённай маёмасцю, але і маёмасцю падданых. Спецыфічны характар уласнасці ў Маскові, на думку Пайпса, прывёў да фармавання асаблівай нацыянальнай культуры ў Расіі, фундаментальныя каштоўнасці якой розніліся ад каштоўнасцяў заходняй цывілізацыі, часткай якой была і Беларусь. Самаўладства цара і бюракратыі ў дачыненні да маёмасці падданых рабіла немагчымым у Расіі і развіццё дэмакратыі.

Такім чынам, лічыць Пайпс, бальшавіцкі пераварот паставіў гісторыю Расіі на ўласцівыя ёй рэйкі. І насамрэч рэвалюцыя адбылася ў лютым, а ў кастрычніку надышла жорсткая рэакцыя — з іншымі тварамі і метадамі. Яшчэ больш жорсткімі, чым у перыяд манархіі.

У выніку расійская дэмакратыя праз лічаныя месяцы абрынулася ў савецкую прорву.

### Луцкевіч і Ленін

Для Беларусі падзеі 1917 года былі важнымі. Вынікам нестабільнасці Расіі стала магчымасць змагання за незалежнасць краю. БНР сталася магчымай таму, што бальшавіцкая палітыка радыкалізавала беларускі нацыянальны рух. Але ці была ў тым добрая воля бальшавікоў?

Меркаваная сустрэча прэм'ера Беларускай Народнай Рэспублікі Антона Луцкевіча з Леніным, на якой апошні, нібыта, мог пагадзіцца на прызнанне БНР, не знаходзіць пацверджанняў. Наадварот. Як сведчыць гісторык Анатоль Сідарэвіч, калі А.Луцкевіч сустракаўся ў Кіеве з кіраўніком СНК Украіны Х.Ракоўскім, той даў зразумець, што бальшавікі не прызнаюць незалежнасці БНР, нават калі беларускі ўрад увядзе ў дзеянне савецкую канстытуцыю. А тое, што зрабілі камуністы з беларускай нацыянальнай элітай у 1930-я, адкінула нас на дзесяткі гадоў назад.

**Аляксандр Пілецкі**

# Дзень, калі ўпала сцяна

Мае першыя працоўныя крокі былі зроблены ў Заходнім Берліне, куды мяне пасля МГІМО ў 1984 г. накіравалі на працу ў генконсульства СССР. Піша **Віктар Чайчыц**.

20 гадоў таму былі ліквідаваныя памежныя збудаванні паміж Заходнім і Усходнім Берлінам. Упала Берлінская сцяна.



9 лістапада 2009 года ва ўсёй Еўропе будуць адзначаць 20-годдзе ліквідацыі Берлінскай сцяны — штучнага і пачварнага збудавання часоў «халоднай вайны», якое ў 1961—1989 гг. дзяліла Берлін на дзве часткі. Пасярэдзіне горада праходзіла граніца з бетоннымі сценамі і калючым дротам. Агульная яе даўжыня па жылых кварталах складала каля 40 км, а па ўсім перыметры Заходняга Берліна — каля 150 км, вышыня памежных збудаванняў была ад 3,40 да 4,20 м (!).

Гэта была сапраўдная граніца, дзе стралялі. Берлінская сцяна ўзнікла ў выніку ідэалагічнага, ваеннага і эканамічнага супрацьстаяння ў Еўропе і ў выніку няздольнасці тагачасных кіраўнікоў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі дамовіцца наконт аб'яднання Германіі.

Сцяна і пагранічны кантроль былі ўсталяваныя 13 жніўня 1961 г. уладамі ГДР са згоды і пры маральнай падтрымцы СССР, каб спыніць уцёкі ўсходніх немцаў на Захад. Праз адкрытыя да 1961 г. граніцы з ГДР выехала каля 3 млн чалавек з 15 мільёнаў насельніцтва!

Сцяна стала сімвалам несвабоды, расколу не толькі Берліна, Германіі, але і Еўропы ў цэлым. Яна падрывала чалавечую годнасць берлінцаў, бо прайшла па сем'ях, душах і лёсах.

Для мяне 1980-я ў Берліне спляліся ў неразрыўны клубок гісторыі, палітыкі, беларушчыны і асабістых перажыванняў. У Берліне закладваліся падмуркі як маёй прафесійнай дзейнасці, так і сямейнага жыцця: тут мы з жонкай упершыню змаглі жыць у асобнай кватэры, тут я ўпершыню ўбачыў сваіх двух сыноў.

### Асабістая гісторыя за Сцяною

Так здарылася, што мае першыя працоўныя крокі былі зроблены ў Заходнім Берліне, куды я ў 1984 г. быў накіраваны на працу ў генеральнае консульства СССР пасля вучобы ў інстытуце міжнародных адносін у Маскве. Я атрымаў добрую адукацыю і спецыялізацыю па нямецкамоўных краінах. Як і ўсе, марыў паехаць туды працаваць — у ФРГ, ГДР, Аўстрыю ці Швейцарыю. Заходні Берлін у мой спіс ніяк не ўваходзіў, бо лічыўся не краінай, а «асаблівым палітычным утварэннем». Як толькі я даведаўся пра камандзіроўку, узгадаў ідэалагічны штамп — «гняздо палітычных дыверсій» супраць сацыялістычных краін, горад з акупацыйным рэжымам, дзе камандуюць амерыканцы. Але выбару не было: трэба было ехаць.

Першы дзень працы ў генконсульстве выпаў на 13 жніўня — гадавіну ўзвядзення Берлінскай сцяны — і прайшоў у атмасферы дэманстрацый супраць палітыкі ГДР у галіне свабоды перамяшчэння людзей. На кантрасце з гэтай палітыкай ГДР (за якой, канечне ж, стаяў СССР) акупацыйныя ўлады ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі змаглі стварыць даволі прывабныя ўмовы для насельніцтва Заходняга Берліна.

### Член сям'і ў закладніках

Жыццё за Берлінскаю сцяною мела свае асаблівасці. Нягледзячы на фізічна і псіхалагічна звужаную гарадскую прастору, існавала дзіўнае пачуццё свабоды. Я як дыпламат мог даволі свабодна рухацца праз граніцу, а на цэнтральным берлінскім КПП «Чэкпойнт Чарлі» службовы аўтамабіль нават не спынялі.

Кіраўніцтва генконсульства раіла супрацоўнікам выязджаць з сем'ямі ў ГДР, асабліва на савецкія святы, каб «пазбегнуць правакацыяў у варожым асяроддзі» Заходняга Берліна. А вось да сябе ў госці мы амаль нікога запрасіць не маглі. Нам не дазвалялі запрашаць бацькоў, сяброў і нават сем'і ў поўным складзе калег з пасольства СССР у ГДР (адзін з членаў сям'і павінен быў застацца як закладнік). У гэтай сувязі ўспамінаю берлінскія жарты аб тым, што яшчэ невядома, хто ад каго адгарадзіўся сцяною і хто каго баяўся. З боку Заходняга Берліна да сцяны можна было падысці, нават размаляваць яе, а з боку ГДР была пагранічная зона з сабакамі і патрульнымі вышкамі.

### Адкрыў беларушчыну ў Берліне

Так здарылася, што Заходні Берлін дапамог мне ў паглыбленні ведаў пра беларушчыну. Цікавай і новай крыніцай інфармацыі стала бібліятэка Свабоднага ўніверсітэта. Я знайшоў там цэлы беларускі аддзел, дзе было шмат эмігранцкай літаратуры. Там упершыню прачытаў В.Ластоўскага, Л.Геніюш, Р.Астроўскага, Я.Станкевіча і іншых, а таксама Біблію на беларускай мове.

> Прапускны рэжым на заходніх граніцах Беларусі — недарэчны рэлікт, вынік няздольнасці ЕС і Мінска дамовіцца.

Каб не адарвацца ад жыцця ў Беларусі, я выпісваў штотыднёвік «Літаратура і мастацтва». Атрымоўваў яго, праўда, з вялікім спазненнем, бо дасылаўся ён праз палявую пошту савецкіх войскаў у Германіі, а потым трапляў да мяне ў Заходні Берлін праз пасольства СССР у ГДР. Часта яго нехта забіраў, гэта мяне спачатку вельмі злавала, але потым я нават узрадаваўся: у Германіі аказалася нямала калег-беларусаў, якія з задавальненнем чыталі па-беларуску.

### Сустрэча з Быкавым

Летам 1988 года ў Заходнім Берліне я пазнаёміўся з Васілём Быкавым, які прыехаў у камандзіроўку. Памятаю, павітаўся з ім па-беларуску, сказаў хто я і адкуль, а ён на хвілінку задумаўся і перш-наперш сказаў: «У Вас, пэўна, вельмі старажытнае беларускае прозвішча...». Потым я суправаджаў пісьменніка на сустрэчах з немцамі, дыскутаваў з ім наконт падзей на Беларусі, лёсу беларускай мовы.

У канцы 1980-х сітуацыя ў Берліне была напружаная. Палітычны рэжым у ГДР і Берлінская сцяна пачыналі хістацца. Моладзь у сталіцы ГДР адкрыта вітала нават аўтамабілі з Заходняга Берліна. Бывала і мне ля граніцы, не разабраўшы нумарныя знакі, махалі і крычалі: «Сцяну — далоў!»

Адным з яркіх уражанняў таго часу стаў канцэрт вядомага гурту «Пінк Флойд» перад будынкам Рэйхстага, непасрэдна каля сцяны ў 1988 годзе. Гукаўзмацняльная апаратура была пастаўлена так, каб было чуваць і ў Берліне ГДР. І там тысячы людзей, якіх ледзьве стрымлівалі пагранічнікі, таксама слухалі канцэрт пад сімвалічнаю назваю «Сцяна» (меламаны ведаюць, што так называўся легендарны альбом гурту), які быў разлічаны і на іх. Спевы разліваліся ў паветры, і іх нельга было спыніць бетоннымі пагранічнымі плітамі. Пасля канцэрта я зразумеў, што сцяна доўга не пражыве... Бо так захацелі людзі з абодвух яе бакоў, і ў іх вачах не было страху!

Сёння сцяна знікла як фізічны бар'ер, але немцам нават да гэтага часу не ўдалося цалкам забыцца пра яе, хаця ўжо вырасла новае пакаленне берлінцаў. Тым не менш, ніхто з немцаў не хацеў бы вяртання старых часоў, бо ўсе глынулі свабоды.

### Жыццё пакарае таго, хто спазняецца

Жыццё пакарае таго, хто спазняецца, як некалі сказаў М.Гарбачоў, звяртаючыся да кіраўніцтва ГДР. Рэжым ГДР спазніўся (а можа не захацеў) зразумець новыя тэндэнцыі ў Еўропе, настрой і інтарэсы свайго народа, таму знік літаральна за дзень, хаця здаваўся такім непахісным за бетонным берлінскім мурам.

У той дзень 9 лістапада 1989 г., калі пад націскам людзей упала сцяна ў Берліне, мы з жонкай купілі шампанскае і выпілі за разбурэнне муроў і граніц, якія раздзяляюць людзей. Вельмі спадзяюся, што некалі вып'ем за гэта, едучы ў Варшаву або Вільню, і на рэштках заходніх граніц Беларусі, якія мне нагадваюць былую берлінскую сцяну. У гэтым рэгіёне стагоддзямі не было граніцаў, тут людзі, ідэі, культура і эканоміка свабодна перамяшчаліся. А сёння, у XXI стагоддзі, насуперак логіцы еўрапейскага цывілізацыйнага развіцця, тут раптам набудавалі глухія межы.

Прапускны рэжым на заходніх граніцах Беларусі — недарэчны рэлікт і вынік няздольнасці ЕС і афіцыйнага Мінска дамовіцца ў інтарэсах свабоды людзей. Еўрапейскаму Саюзу павінна быць сорамна за шэнгенскі мур, які аддзяляе Беларусь, і за тое, што з беларусаў бяруць грошы за візы па падвышаным тарыфе! Ну, а што датычыцца нас, то юбілей ліквідацыі берлінскай сцяны павінен паслужыць нам прыкладам грамадзянскай актыўнасці і памагчы ўсвядоміць, што і мы еўрапейцы, што наша месца ў вольнай Еўропе. І што граніцы будуць існаваць, пакуль мы будзем іх цярпець.

**Віктар Чайчыц**

Дыпламат. Дарадца пасольства Беларусі ў Германіі (1992—1995). Цяпер жыве і працуе ў Маскве.



# «Тройца» ў КЗ «Мінск»

**15 лістапада ў канцэртнай зале «Мінск» — юбілейны канцэрт этна-трыа «Тройца» «Аўтабаны і менестрэлі». Пачатак а 19-й.**

## КАНЦЭРТЫ

### «Яблычная гарбата»

**11 лістапада ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — канцэрт джазавага гурту Apple Tea. **Пачатак а 19-й.**

### Sciana ў Гродне

**12 лістапада** — дзве з паловай гадзіны рок-н-рола ад Sciana і UNIA **ў Гродне**! **Адрас: бульвар Ленінскага Камсамола, 21, ліцэй №1. Пачатак а 19-й.**

### «Без білета»

**12 лістапада ў «Рэактары» (вул. Харужай, 29)** гурт «Без Білета» прэзентуе новы альбом «Афрыка». **Пачатак а 19-й. 13 лістапада** тамсама гурт святкуе 10-годдзе. Настальгічная праграма. **Пачатак а 19-й.**

### Madera Hard Blues & White Night Blues

**12 лістапада ў «Графіці»** — Madera Hard Blues & White Night Blues. **Пачатак а 19-й.**

### Cinema bizzare

**11 лістапада ў WestWorldClub (вул.Старажоўская, 15а)** — канцэрт нямецкага гурту «Cinema bizzare». **Пачатак а 19-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### Беларуская музычная восень

**5 лістапада** — «Шэдэўры сусветнага арганнага мастацтва» ў выкананні Рональда Эбрэхта (ЗША). **6 лістапада** — выступае Народны аркестр імя І.Жыновіча. У праграме — папулярныя песні ансамбля «Песняры» Уладзіміра Мулявіна. 7 лістапада — выступае Акадэмічны хор імя Г.Цітовіча. **Пачатак канцэртаў у Вялікай канцэртнай зале Філармоніі а 19-й.**

### Ад неба на паўметра 2009

Этна-фэст «Ад неба на паўметра 2009» пройдзе **5 лістапада ў ДК МАЗ**. На сцэне з'явяцца дзіцячы фальклорны ансамбль **«Святкі»**, ансамбль народнай музыкі і песні **«Мінскія Музыкі»**, **Алег Хаменка**, **Guda**, **Rokash**, **Unia**, **Hohaband**, **Akana-NHS**, **«Гаротніца»**, **Energy**, **Dzivasil**, **«Нагуаль»**, **«Князь Мышкін»**.

### Фестываль электроннай музыкі

**14 лістапада ў выставачным комплексе «Белэкспа» (пр.Пераможцаў, 14)** пройдзе міжнародны фестываль электроннай музыкі «Godskitchen Urban Wave». **Пачатак а 22-й.** Упершыню ў Беларусі выступяць галандскі ды-джэй Сандэр Ван Дорн і брытанскі ды-джэй Марк Ітсан.

### Пісьменнікі ў Любанскім раёне

**12 лістапада** паэты Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк і празаік Барыс Пятровіч сустрэнуцца з чытачамі ў вясковых школах Любанскага раёна. **СШ вёскі Загалле прыме паэтаў а 10-й, СШ вёскі Сосны — у 11.15, Палічынская вясковая школа — у 12.30, а ў 13.30 — СШ вёскі Малыя Гарадзяцічы.**

### «Можна!» у Маскве

Другі фестываль актуальнай беларускай музыкі ў Маскве «Можна!» пачнецца **6 лістапада а 19-й у клубе IKRA (Масква, м. Курская, вул. Казакова, 8а)**. Бяруць удзел: **«Срэбнае вяселле»**, **«Адыс Абеба»**, **Сяргей Пукст і Pukstband**, **«Петля Пристрастия»**, **«Нагуаль»**, **«Касіяпея»**, **Cherryvata**.

### Фестываль электронных танцаў

**8 лістапада ў клубе РОКСІ (вул.Свярдлова, 2)** пройдзе другі нацыянальны электра-дэнс івэнт «Teck2nation-TK2N™». Гэтыя танцы вядомыя яшчэ як «тэктонік» — танцавальны рух, што распачаўся ў Парыжы ў 2000 г. На фестывалі будуць прадстаўленыя намінацыі: найлепшая каманда, найлепшая двойка, найлепшы сола-танцор.

### Вечар перад падзеннем Берлінскага мура

**8 лістапада Goethe-Institut (вул.Харужай, 25/3, 4 паверх)** запрашае на Вечар перад падзеннем Берлінскага мура — святкаванне 20 гадоў знікнення «Жалезнай заслоны». У праграме: дыскусія са сведкамі падзей, прэзентацыя вынікаў творчага конкурса «Сямейны альбом. 1989—2009», паказ фільма «Царква Св. Мікалая». **Пачатак а 17-й.** Мерапрыемства пройдзе на нямецкай мове. Уваход вольны.

### Найпрыгажэйшыя паэткі

**6 лістапада ў бібліятэцы імя Цёткі (вул.Талбухіна, 12а)** — літаратурна-забаўляльная праграма найпрыгажэйшых дзяўчат-паэтак «Культурныя формы» з удзелам Тацяны Беланогай, Юліі Новік, Вікі Трэнас, Ганны Федарук. **Пачатак у 18.30.**

## ВЫСТАВЫ

### Камізэлька Сяргея Прытыцкага

**У Нацыянальным гістарычным музеі (вул.Маркса,12)** праходзіць выстава, прысвечаная 70-годдзю аб'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. На ёй сабраны настолькі цікавыя экспанаты, што дзіву даешся, як яны захаваліся! Напрыклад, камізэлька Сяргея Прытыцкага з дзіркай ад кулі, якой яго паранілі паліцыянты, пасля таго як падчас суду ў Вільні ён страляў у правакатара, які выдаў шмат таварышаў Сяргея. Мундзіры польскіх, савецкіх, нямецкіх жаўнераў таго часу. Сучасныя берасцяныя граматы — транспаранты, выкананыя ў Беларусі прыхільнікамі камуністаў з падручных матэрыялаў і падручным правапісам і лексікай. Вельмі цікава! Нацыянальны гістарычны на вышыні!



### Millenium

**У Палацы мастацтва да 15 лістапада** працуе выстава «Millenium», прысвечаная 1000-годдзю першай згадкі ў пісьмовых крыніцах наймення Літва. Поруч з творамі беларускіх мастакоў розных пакаленняў асобны раздзел экспазіцыі складаюць творы дзяцей Беларусі і іншых дзяцей свету.

### Польскі пейзаж

**У Музеі сучаснага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47)** працуе выстава «Польскі пейзаж». Яна складаецца з твораў, якія паўсталі падчас грамадска-палітычных зменаў, у перыяд, які для польскага мастацтва аказаўся надзвычай плённым. Выставу адкрывае рэалістычная карціна Лявона Тарасэвіча — выдатнага беларускага творцы, які нарадзіўся і жыве ў Польшчы, а замыкае — манахромная кампазіцыя Войцеха Лазарчыка, ствараючы вельмі сімвалічную рамку. Абедзве яны служаць зыходным пунктам для твора Рафала Буйноўскага — карціны і фільма, які паказвае працэс малявання чорна-белага рэалістычнага пейзажа.




### Падарожжа па мінулым стагоддзі

**У Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20) да 22 лістапада** працягваецца выстава Уладзіміра Тоўсціка «Падарожжа па мінулым стагоддзі». Стылёвы і таленавіты жывапіс, які, без сумнення, знойдзе водгук у пакаленнях. Незвычайная манера пісьма, тонкія лініі, чыстыя фарбы. Радасна ўсведамляць, што гэты мастак жыве ў Мінску побач з табой. Абавязкова варта наведаць.

## ТЭАТР

### 5 лістапада

**Тэатр юнага гледача** — «Ліса і вінаград»
**Тэатр імя Горкага** — «Я твая нявеста»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Музычны тэатр** — «Баядэра»
**Тэатр оперы і балета** — «Моцарт і Сальеры. Канцэрт»

### 6 лістапада

**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар'яцелага музыкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Пахіта». «Свет не сканчаецца ля дзвярэй дома». «Балеро».
**Музычны тэатр** — «Магія любові»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Карусель»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

### 8 лістапада

**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Музычны тэатр** — «Бураціна.by»
**Тэатр оперы і балета** — «Беласнежка і сем гномаў»
**Музычны тэатр** — «Нябесны ціхаход»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

### 10 лістапада

**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Тэатр юнага гледача** — «Матыль»
**Музычны тэатр** — «Бабскі бунт»

### 11 лістапада

**Музычны тэатр** — «Рускі фантом»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Кавярня разбітых сэрцаў»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Тэатр оперы і балета** — «Баядэрка»

### 12 лістапада

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Музычны тэатр** — «Севастопальскі вальс»

### 13 лістапада

**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Загадкавыя варыяцыі»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»

### 14 лістапада

**Тэатр юнага гледача** — «Падарожжа ў Княства Сноў»
**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Музычны тэатр** — «Шахеразада». «Іспанскія мініяцюры».
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

### 15 лістапада

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і брадвей»
**Музычны тэатр** — «Кажан»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

## КІНААФІША

### Смерць Джэксана з салютам

«Вось яно!», This Is It, ЗША, 2009, дакументальны, 90 хв., рэж. Кені Артэга

Вас не пусцяць за кулісы ягонага канцэрта, вам не дадуць з дапамогай буйных планаў абгледзець зморшчыны і сляды ад новых пластычных аперацыяў на ягоным твары, з вамі не падзеляцца інфармацыяй пра расклад ягонага апошняга дня; ён жа не раскрые, чым ён пераймаўся тымі днямі. Новы дакументальны фільм «Вось яно!», які асвятляе апошнія рэпетыцыі Майкла Джэксана перад няспраўджанымі канцэртамі ў Лондане, не дадасць новых фактаў пра жыццё і смерць караля поп-музыкі... Але ж чаму пятнічным вечарам зала мінскага кінатэатра «Масква» набіткаваная публікай, што, падпяваючы і пляскаючы ў рытм, імпэтна рэагуе на любую, нават самую дробную, мізансцэну з дакументальніка, нібы там не паўтарагадзіннае сола на нагах, а паўнакроўны блакбастэр?

Адразу пасля раптоўнай смерці Майкла Джэксана ў свеце пачалі пашырацца плёткі, што ў апошнія дні ён ужо быў няздатным ні на што артыстам. Казалі, што ён настолькі хворы і зануураны ў свае снатворныя таблеткі, што не мае найменшага шанцу вытрымаць усе пяцьдзесят запланаваных лонданскіх выступаў...

Але ў выпушчаным адначасова на 18 тысяч экранаў фільме «Вось яно!» мы бачым іншае. Гэтая, складзеная са здымачных эпізодаў падчас рэпетыцый перад вялізным турнэ, дакументальная стужка — кранальнае сведчанне незгасання таленту. Таблеткі — нішто, адоранасць — усё. У фільме Джэксан не толькі дэманструе гатоўнасць для пяцідзесяці выступаў запар, ён яшчэ кіруе вялікай камандай танцоўшчыкаў-віртуозаў, яскравых музыкаў, асвятляльнікаў і гукарэжысёраў, не забываючыся і сам даць глыбокага нырца ў нутро музыкі і да самазабыцця аддацца рухам цела. За лічаныя імгненні да смерці 50-гадовы Майкл Джэксан з задавальненем паказвае, на што здатны выдатнік індустрыі забаваў і ўлюбёнец Усявышняга. Ён настолькі зануураны ў прадстаўленне, што, здаецца, яму прасцей хадзіць па сцэне месяцовай хадой, чым звычайнай — па вуліцы.

Гэта не запіс канцэрта і не звычайны дакументальны фільм. У дадатак варта засумнявацца, што падобная стужка знятая «адно для прыватнага архіва». Перфекцыяніст Джэксан, які цудоўна ўсведамляў, што ён — гэта ягоная публіка, пэўна, зусім не хацеў, каб мы ўзялі з паліцы сутарэння бляклае сямейнае відэа. «Вось яно!» — гэта выдатна абсталяванае дакументальнымі дэкарацыямі зорнае вяртанне. Хіба так склалася, што Джэксан зрэжысаваў уласную смерць. Прафесійна, з салютам.

У стужцы «Вось яно!» нічога новага — адно старыя добрыя чары мастацтва і майстэрства. Хаджэнні чалавецтва па Месяцы працягваюцца.

**Ліза Кавальчык**



# Веліч маленькага

**Чаму ў свеце ёсць тавары—«міні»? Піша Ліза Кавальчык.**

Многіх хлебам не кармі, а дай спажыць штo малое: з'есці 20-грамовую шакаладку «Алёнка», глынуць з маленькай упакоўкі соку ды надухмяніцца парфумай з флаконаў-«пробнікаў». Гэты немалы сектар насельніцтва адказны за камерцыйны поспех такіх тавараў як 0,05-літровыя пляшачкі з алкаголем, партатыўныя дыскі для электроннай памяці (флэшкі) і міні-камп'ютары.



### Які ж стол без стэплера?

Маркетолагі лічаць, што перавагі спажывання міні-тавараў — зручнасць, эканомія месца і грошай, а таксама жаданне спажываць умеркаваныя дозы. З дзяцінства памятаю, як захапілася міні-нажнічкамі. Атрымаўшы ў падарунак нажнічкі, адразу абрэзала шарыкавы стрыжань напапалам, каб зрабіць мініасадку. Падарожжа ў краіну «міні»



скончылася прачуханкай ад бацькоў за запэцканую пастай падлогу...

Цяпер пеналы школьнікаў набіткаваныя дробнымі прыладамі: міні-асадкі, міні-стэплеры, ліпучыя аркушыкі, якія замянілі грувасткія нататнікі... Але і стол не пустуе: пасля замены пукатага манітора камп'ютара на пляскаты на вольнае месца хлынулі паўпатрэбныя драбніцы.

Эканомія месца і грошай каже? Толькі не з маленькімі таварамі.




### Міні-мы і міні-яны

На Захадзе ў продажы ёсць і маленькія цюбікі зубной пасты, якія эканомяць месца ў падарожнай торбе, і дробныя бляшанкі з пенай для галення, і маленькія ролікі памады з ланцужком для мабільніка.

У Беларусі феномен «міні» най-



лепш бачны ў прадуктовых таварах. Пакуль у СССР выводзілі гіганцкія памідоры памерам са сланавое сэрца, на Захадзе выгадавалі гатунак-міні «Чэры», памерамі і саладкасцю больш падобны да вішні. З'явіліся і персанальныя кавуны, і перчыкі ў чвэрць звычайнага памеру. У нас замежную міні-садавіну і гароднiну можна купіць толькі на рынках і ў лічаных супермаркетах.

З гастраномі ў хатні дызайн: усё больш уладальнікаў беларускіх кватэр хочуць дакрануцца да хара-



ства дзікай прыроды, не адмаўляючыся ад кватэрнага камфорту. Гэта мы пра дрэва бансай.

### Вось такія мы, мініятурманы, загадкавыя

Многіх у малых таварах вабіць эксклюзіў: міні-версіі вядомых прадуктаў не заўсёды можна купіць. Гэта як асабісты маніфест: я чала-



век нестандартны, а таму і спажываю нестандартнае.

Маркетолагі тлумачаць, што спажыўцы набываюць міні-тавары, бо яны практычныя, эканамічныя і зручныя. Але, руку на сэрца: той жа тавар, толькі ў версіі «міні» — смачнейшы, ваблівейшы, жаданейшы і мілейшы за вялікі арыгінал.



Маленькія рэчы вабяць спажыўца ў паралельны свет, як Алісу ў Дзівосную краіну, дзе наіўныя і легкадумныя пробнікі супрацьстаяць свету звычайнага «стопудовага» тавару. Калі амерыканцы ці галандцы купляюць




горы міні-цюбікаў з зубной пастай, яны найменш турбуюцца пра здароўе дзяснаў. Тут прачынаецца штосьці менш вытлумачальнае, менш абумоўленае эканомікай ды прафілактыкай. І ці варта казаць, што гэтыя маленькія радасці абуджаюць у шмат кім яшчэ і інстынкт калекцыянера?

Намі, спажыўцамі, кіруюць не заўжды эканамічныя і рацыянальныя матывы.

# Windows 7 яшчэ не прадавалі

**а на кожным дваццатым беларускім кампутарыяна ўжо стаіць.**

Аналітычная кампанія Net Applications добра пасмяшыла беларускіх камп'ютарных карыстальнікаў. Згодна з падлікамі экспертаў, у Беларусі на 5,6% камп'ютараў усталявана новая аперацыйная сістэма Windows 7. І гэта за пяць дзён афіцыйных продажаў у свеце. Па гэтым паказчыку наша краіна лічыцца трэцяй ў Еўропе!

### Няма дакументацыі. І попыту

Смешна тут тое, што ў Беларусі аперацыйная сістэма яшчэ не пачала прадавацца... Як вядома, асобнага прадстаўніцтва Microsoft у нашай краіне няма, а існуе супольнае аддзяленне для Украіны і Беларусі. Пастаўкі ў Беларусь ідуць наўпрост. Дыстрыб'ютарамі Microsoft з'яўляюцца «ElkoTelecom LTD» і «ASBIS Беларусь».

Спецыялістка «ElkoTelecom LTD» Вольга Фурман паведаміла, што версіі Windows 7 для фізічных асобаў ужо з'явіліся ў прайсе кампаніі, але яшчэ не пастаўляліся «праз невялікі попыт». А вось версіі для зборшчыкаў камп'ютараў ужо паступілі на склад і хутка трапяць у продаж.

Прадстаўніца «ASBIS Беларусь» Вераніка Сянько расказала, што Windows 7 пакуль не з'явілася ў продажы і ў іх кампаніі: ідзе праца з дакументацыяй, бо патрабаванні да яе ў Беларусі і астатніх еўрапейскіх краінах адрозніваюцца. Хутчэй за ўсё продажы пачнуцца ў сярэдзіне лістапада, удакладніла Вераніка Сянько.

### Усё для студэнтаў

Тым не менш, у Беларусі ёсць шмат легальных карыстальнікаў ліцэнзійнай Windows 7.

У рамках праграмы MSDN Academic Alliance сту-




дэнты тэхнічных спецыяльнасцяў могуць атрымліваць прадукт Microsoft бясплатна. У Беларусі такія дамоўленасці заключаныя з факультэтамі радыёфізікі і прыкладной матэматыкі у БДУ і факультэтам камп'ютарных сетак у БДУІРы.

Таксама Microsoft ладзіў адмысловую акцыю па тэставанні «семкі», дзе яе Release Candidate можна было спампаваць цалкам легальна, атрымаць серыйны нумар і карыстацца на працягу года. Нямала людзей гэтым скарысталіся.

### Два мільёны ці дзесяць тысяч?

Пакуль што ў краіне можна купіць толькі піратскую версію. Амаль у кожнай краме з дыскамі прадаецца Windows 7. Дыск каштуе 10—12 тысяч рублёў. Ліцэнзійная праграма даражэйшая ў сотні разоў — ад 262 000 да 2 124 000 рублёў.

**Ягор Марціновіч**

# Кампанія Google узялася за стварэнне падрабязнай трохмернай мапы свету

На сваім афіцыйным блогу Google абвясціў аб запуску новага online сэрвіса пад назваю «Google Building Maker». Дзякуючы яму, пры дапамозе ўжо вядомай мапы Google Maps карыстальнікі сеціва змогуць стварыць трохмерныя мадэлі будынкаў сваіх гарадоў.

Асаблівых ведаў, каб зрабіць віртуальную мадэль свайго дома альбо месца працы, не трэба. Дастаткова ўсталяваць невялікае пашырэнне. Само ж праектаванне адбываецца пры дапамозе гатовых трохмерных формаў і фотаздымкаў з паветра. Пасля стварэння мадэлі яна пацвярджаецца мадэратарамі, дадаецца ў базу дадзеных і становіцца бачнай іншым карыстальнікам.

Пакуль людзі, якія захочуць паўдзельнічаць у сусветным 3D будаўніцтве, могуць выбіраць з 50-ці гарадоў свету, аднак гэты спіс пастаянна пашыраецца.

Сэрвісы «Google Maps» яшчэ слаба прадстаўленыя ў Беларусі, таму трохмерная мапа нашай краіны застаецца толькі ў марах беларускіх інтэрнэтчыкаў. Адмыслоўцы ж карпарацыі Google тым часам працягваюць маштабную новабудоўлю планеты і спадзяюцца ў хуткім часе стварыць дакладную трохмерную копію Зямлі.

**ІМ**

## НАША СТРАВА

### Зразы закручаныя, па-беларуску

1,5—2 кг ялавічыны, соль, перац, 2 цыбулі, 200 г хлеба, 1 яйка, 200 г лою або сала, 1—1,5 лыжкі масла, 1 шклянка булёну

Мяса са сцегняка парэзаць вялікімі тонкімі кавалкамі папярок валокан, моцна адбіць, пасаліць, папярчыць і даць пастаяць 15 хвілін. Цыбулю дробна пасекчы, змяшаць з цёртымі сухарамі або хлебам, убіць у атрыманую масу 1 або больш яек, добра перамяшаць фарш. На кожны кавалак мяса палажыць фарш, мяса звярнуць і моцна закруціць ніткай, каб зразы не раскрыліся. Растапіць ычачны лой або сала, скваркі дастаць, пакласці на патэльню зразы і пячы пад крышкай на агні або на вуголлі. Калі зразы падрумяняцца, дадаць троху булёну і кавалак масла. Па меры патрэбы дадаваць булён, пакуль зразы не будуць гатовыя.

З кнігі: Вінцэнта Завадская, «Кухарка літоўская»

**Рэцэпт тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

## ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

РЫГОР БАРАДУЛІН

### СКАКАЛКА

А на золку
За бугром
Праз вясёлку
Скача гром.
Скача,
Скача
Без аглядкі,
Толькі над палянкамі
Бліскаюць вясёла пяткі
Зыркімі маланкамі.
Раз–два,
Раз–два –
Долу хіліцца трава.
Раз–два–тры,
Раз–два–тры –
Усміхаюцца бары.
Раз–два–тры–чатыры –
Светла ўсёй нябеснай шыры...
Раз–два–тры–чатыры–пяць –
Гром пайшоў за мора спаць.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем Настассюі Канстанціна Мацяшаў** з нараджэннем другога сыночка. Хай расце здаровым на радасць бацькам. Сябры і былыя калегі

**Віншую Ёкшу Марылю** з Днём народзінаў! Кахаю цябе, Марылька! Здароўя і жыццёвай асалоды табе! Арцём

### СПАЧУВАННІ

**Выказваем шчырыя спачуванні Таццяне Дубавец**, яе родным і блізкім з нагоды вялікага гора — смерці маці. Смуткуем разам з вамі. Супакаення яе душы. Сябры і калегі

### КУРСЫ

**Аляксандр Лагвінец** у супрацоўніцтве з Беларускім Калегіумамі Таварыствам беларускае мовы абвяшчае набор слухачоў на курс «Інтэграцыйныя працэсы ды інстытуцыі Еўрасаюза». Слухачы курса маюць магчымасць браць удзел у праграмах абмену, які рэалізуецца супольна з еўрапейскімі адукацыйнымі ўстановамі. Арганізацыйнае спатканне адбудзецца 6 лістапада у 17.00 на сядзібе Таварыства беларускай мовы (вул. Румянцава, 13).

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Запрашаем** у падарожжа 29 лістапада (нядзеля) па маршруце: Мінск—Княжыцы—Магілёў—Мінск. Т.: 292–54–58, (029) 622–57–20, 110–19–28, 509–12–16

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) ці праз размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!




**Беларусы адзначылі Дзень памяці продкаў «Дзяды». Рэпартаж з Курапатаў — старонка ...**




**Сто нацыянальных сцягоў вывесілі 29 кастрычніка на галоўным праспекце сталіцы актывісты кампаніі «Еўрапейская Беларусь». Раззлаваная міліцыя затрымала траіх ці то ўдзельнікаў хэпенінгу, ці то прахожых, якія захоплена фатаграфавалі відовішча: Алега Ладуцьку, Насцю Аскерку, Галіну Пярвушыну. А заадно і фотакарэспандэнтаў Юлію Дарашкевіч і Уладзія Грыдзіна. Фатографаў адпусцілі (Грыдзіна патаўклі), юнакоў пратрымалі ноч у арышце і на наступны дзень аштрафавалі.**




**Новы інтэрнэт-праект «News Cafe с Петром Марцевым» шырока рэкламаваўся як гутарка ў простым эфіры з «вядомымі бізнэсоўцамі, акторамі, лідэрамі думак». Цікава, што на сваю першую перадачу Пётр Марцаў, рэдактар «Белорусской деловой газеты», запрасіў Сяргея Атрошчанку — блізкага да ўладаў бізнэсоўца, які спрабаваў зачыніць «Свободные новости» і «Народную волю». «О мір табе, шчаслівы міг яднання», — так іранізаваў над падобнымі выпадкамі Максім Танк.**




**Гэты рэкламны каляндар выпусціла фірма-вытворца трунаў.**



**Чуткі пра хуткі сыход Кім Чэн Іра не пацвярджаюцца. Карэйскі дыктатар наведаў птушкафабрыку і ўказаў на недахопы ў яе працы.**

## АНЕКДОТЫ

— Вось ты мне можаш патлумачыць, чаму вы, мужыкі, так рэдка дорыце дзяўчатам кветкі?

— Ну дык вы нам піва зусім не дорыце!

* * *

Прыяцелі размаўляюць:

— Мая цешча ўчора хадзіла на выставу змей.

— І што?

— Вярнулася з медалём.

* * *

— Ну што, дапамагла табе варажба?

— Так! Проста жах! Муж вярнуўся!

— Дык чаму жах?

— Дык не цяперашні муж, а першы, нябожчык!

* * *

Мытнік адбірае знойдзеныя ў пасажыра грошы.

— Але я іх вязу на пахаванне дзядулі!

— Яму яны не трэба, а мне трэці паверх дабудоўваць.

* * *

— Афіцыянт! Вашы катлеты на смак, як старыя пантофлі, нацёртыя цыбуляй!

— Ай-ёй! І чаго толькі вам, пане, не даводзілася есці ў жыцці!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Бытань.** З дрэва ўпала борць і забіла адну маленькую дзяўчынку. Каб пахаваць яе, трэба было дастаць дазваленне ад прыстава. Але яго ў той час дома не было, а воласць хаваць не дазваляе. 8 дзён праляжаў труп і ўжо добра пачаў гнісці, калі яго дазволілі хаваць.

**«НН». №44. 1909**

**Гомель.** Камуністы на 7 лістапада збіраліся на плошчы Паўстання, а самыя адчайныя іх працаўнікі — на вуліцы побач з плошчай Паўстання. У 9.15 на іхнюю групу, выскачыўшы з мікрааўтобуса, наляцелі шасцёра ў цывільным і пацягнулі некуды, як сказалі, на гутарку, праваабаронцу Яўгена Мурашку. Праз некаторы час міліцыянты ў форме паспрабавалі забраць у Галіны Арцёменкі (а яна жонка Мурашкі) плакат. Яна не аддавала, дык і яе пацягнулі ў пастарунак. А 10-й гадзіне на плошчы Леніна арыштавалі анархіста Юрася Глушакова, які разгарнуў плакат «Жыве рэвалюцыя! Смерць капіталу!» Сямёра дысідэнтаў усё ж здолелі прабіцца ў калону дэманстрантаў і там узняць лозунгі: «Расія — турма народаў. В.І.Ленін» і «Свабоду палітвязням». Ну ж, нядоўга і яны іх пранеслі. І тых скруцілі.

**«НН». №30. 1999**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6160. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 03.11.2009.
Замова № 6042.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9771819161008 09041